Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдактар—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . . — 90 к. „ 3 „ . . . . 2 р. 70 к. „ 6 „ . . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . . 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя . . . . — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапіраэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапіраэлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапіраэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпецыяльныя па 50 проц. дарожэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . 15 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і па ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 143 (2331) Субота, 23-га чэрвеня 1928 г.

Недахопы пры ажыцьцяўленьні плянаў індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі.

У «Савецкай Беларусі» за 17 чэрвеня зьмешчана пастанова Эканомнарады аб перагляндзе і перасоўцы шэрагу мерапрыёмстваў па індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі. У гэтай пастанове адзначаецца, што да цяперашняга часу па шэрагу мерапрыёмстваў па індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі некаторымі арганізацыямі, як напр.: Белсельтрэстам, Сельсаюзам, а таксама і Гомельскім Акруговым Выканкомам не прадстаўлены выканаўчыя пляны і праэкты, а ў некаторых выпадках адсутнічаюць нават і заяўкі.

Значыць, мы маем перад сабою дакумавт, у якім афіцыйна зафіксіраваны выпадкі, калі справа стаіць не за сродкамі і своечасовым іх атрыманьнем, а справа затрымліваецца і зрываецца, дзякуючы непадрыхтаванасьці. Праўда, на гэты раз практычна магчыма было-б накіраваць гэтыя нескарыстаныя сродкі на іншыя патрэбы, прычым гэтыя сродкі магчыма было-б накіраваць на ня менш важныя і сур'ёзныя задачы, г. зн. па экспартнаму будаўніцтву ў Беларусі.

Але тут важна цяпер адзначыць вусім іншае: гэта значыць такое арганізацыйнае зьявішча, калі мы ўжо канкрэтна сустрэліся з такім зьявішчам, што нашы арганізацыі, установы і наркаматы далёка яшчэ не падрыхтаваны, далёка не ўявілі сабе практычнай і тэхнічнай лініі па ажыцьцяўленьні індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, асабліва па тых дробных прамысловых прадпрыёмствах, якія перапрацоўваюць сельска-гаспадарчую прадукцыю па месцы, у сялянстве.

Мы бачым, што ня было зьвернута своечасова ўвагі на тое, каб былі падабраны неабходныя штаты кваліфікаваных працаўніоў для складаньня канкрэтных будаўнічых плянаў.

Мы бачым, што гэтыя пытаньні ня так актуальна стаялі перад тымі арганізацыямі, якія падрыхтоўваюць папярэднія пытаньні па канкрэтных аб'ектах індустрыялізацыі і сельскай гаспадаркі, няма вопыту і той неабходнай сьмеласьці, якая павінна была-б быць у гэтым пытаньні.

Возьмем пытаньне аб цэнтральнай менскай малочнай станцыі. Гэта пытаньне ўсё яшчэ не атрымала свайго канчатковага вырашэньня.

Будова на ільназаводзе таксама надта марудная і надта нязпэўна пасоўваецца ўперад.

Бэконныя камбінаты ў Воршы праэктаваліся каля трох гадоў і толькі ў гэтым годзе мы больш-менш цвёрда маглі падыйсьці да справы, ня гледзячы на тое, што па Савецкім Саюзе за гэты час пабудован ужо не адзін такі бэконны завод.

Далей, заводы дзеля пераапрацоўкі садавіны і гародніны. Пра іх шмат гаварылася і пісалася, але калі трэба было канкрэтна падыйсьці,—мы бачым, што тэхнічна ўсе пляны складаюцца бяз вопыту, без належнай прадуманасьці і павярхоўна. Тое-ж самае можна сказаць і па шэрагу іншых канкрэтных дробных аб'ектаў нашага сельска-гаспадарчага будаўніцтва. Усюды і заўсёды яшчэ наглядаецца надзвычайная непадрыхтаванасьць.

Возьмем пытаньне сельска-гаспадарчай электрыфікацыі. Доўга прышлося чакаць гэтага пляну, а тормазам зьяўлялася ня толькі няведаньне, дзе знайсьці такія райёны, каб сапраўды нашы маленькія райённыя электрастанцыі, якія мы будуем, адпавядалі духу і разуменьню электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, але і тое, што ня было спэцыяльнага апарату, толькі пасьля таго, калі ў НКЗеме была створана тэхнічная арганізацыйная ячэйка, праца пачынала больш-менш ісьці ўсілена ўперад. Але яшчэ трэба пажадаць лепшага.

Было-б памылкова думаць, што гэтай пастановай Эканомнарады вырашаны ўсе задачы. Мала таго, што Гомельскаму Выканкому даручана безадкладна прадставіць дадатковыя разьлікі па ўказаньню Дзяржаўнай Плянавай Камісіі, а Белсельсаюзу даручана прыцягнуць да адказнасьці тых асоб, якія няўважліва адносіліся да своечасовага складаньня плянаў і каштарысаў па шэрагу аб'ектаў. І ня тым вырашана пытаньне, што Эканомнарада абясьціла выгавар праз друк Праўленьню Белсельтрэсту,—гэтых мер, бязумоўна, мала бяз глыбокага разуменьня пытаньня з боку ўсіх тых арганізацый, на якіх ляжыць ажыцьцяўленьне **такога сур'ёзнага пляну, як індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі** па яе прамысловаму будаўніцтву ў поўным сэнсе слова, і што **саматужнымі мерамі гэтага пляну не ажыцьцявіш**, што мала ведаць толькі аб значэньні такога-та заводу ці такога-та мерапрыёмства, мала ўказаць, што там дзесь у Савецкім Саюзе, дзесь замежамі такія-та заводы працуюць і даюць вялікую карысьць.

Мала казаць, што патрэбен добры сырэц і нехта будзе апрацоўваць яго, нехта прад'явіць попыт на гэты сырэц і г. д. Неабходна ставіць пытаньне значна глыбей, трэба падрыхтаваць тэхнічна такую арганізацыю **тым Наркаматам, якія павінны ажыцьцявіць гэту задачу, трэба мець і людзей і спэцыяльныя ячэйкі, якія штодзень займаліся-б гэтым пытаньнем і штодзень сачылі-б за вопытам у гэтай працы і за ажыцьцяўленьнем таго, што робіцца ў іншых райёнах нашага Саюзу і нават па-за межамі.** Вось чаму бліжэйшай задачай павінна быць абавязкова стварэньне трывалых арганізацыйных і тэхнічных умоў, магчымасьці нармальна тэхнічна і спэцыяльна падрыхтаваць тыя пляны, якія намі на[illegible] сельска-гаспадарчай індус[illegible]ці, і што тут не абыйдзецца [illegible]абавязковага прыцягненьня неабходных і патрэбных высокакваліфікаваных спэцыялістых ня толькі дзеля складаньня плянаў, але і ажыцьцяўленьня іх і для самага будаўніцтва.

Трэба таксама праводзіць і больш шырокае абмеркаваньне як у прэсе, гэтак і ў нашых часопісях тых аб'ектаў, якія практычна сёньня распрацоўваюцца, якія заўтра прыдзецца ажыцьцявіць.

У выпадку неабходнасьці прыдзецца экскурсійным парадкам камандываць людзей, як па Саюзу для вывучэньня тых будаўнічых аб'ектаў, якія зараз ажыцьцёўлены, гэтак і насылаць замежы дзеля атрыманьня неабходных плянаў і экспэртных заўваг, каб самім лябараторна пазнаёміцца, як ажыцьцяўляюцца такія дробныя сельска-гаспадарчыя прадпрыёмствы, якія па сваёй моцнасьці зьяўляюцца як быццам дробязьвю ў параўнаньні з нашым капітальным будаўніцтвам, але па сваёй важнасьці надзвычайна неабходныя і патрэбныя.

Дасканала трэба ўлічыць і зразумець, што плян сельска-гаспадарчай індустрыялізацыі немагчыма ажыцьцявіць толькі адміністрацыйнымі крокамі, а тут трэба значна глыбей і бліжэй падыйсьці да справы, падыйсьці больш плянава і пастэвіць яе на ўзровень тых галін народнай гаспадаркі, якія мы ўжо ажыцьцяўлялем у нашых плянах.

Да такога выводу нам прыходзіцца цяпер прысьці па ажыцьцяўленьні пляну індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі па лініі капітальнага будаўніцтва.

М. КАРКЛІН.

Банкроцтва палітыкі „міру ў прамысловасьці“.

Заклік Мэкстона і Кука да перагляду шляхоў ангельскага рабочага руху.

Ліст у рэдакцыю „Нью Лідэр“.

ЛЁНДАН 21-6. Ліст Мэкстона і Кука складзен у тоне адозвы да рабочых Англіі.

„Мы ня можам заставацца збоку, зазначана ў адозьве,—бачачы, як 30 гадоў самаахвярнае працы нішчацца і з капіталізмам утвараецца згода. З гэтае прычыны мы прапануем правесьці сэрыю канфэрэнцый і мітынгаў па ўсім краі, каб радавыя сябры партыі мелі магчымасьць выказацца: згодны яны з новым пунктам гледжаньня ці застаюцца вернымі ідэалам піанэраў рабочага руху“.

РАБОЧЫЯ ЧАКАЮЦЬ АД АЎТАРАЎ БОЛЬШАЕ ВЫРАЗНАСЬЦІ.

Заява сэкратара ангельскае кампартыі.

ЛЁНДАН, 21-6. Сэкратар ангельскае кампартыі агаласіў заяву наконт ліста Мэкстона і Кука ў рэдакцыю штотыднёвіка незалежнае рабочае партыі «Нью-Лідэр» з паведамленьнем, што яны будуць выступаць на ўсім краі па мітынгах проці лідэраў рабочае партыі.

Заява падкрэсьлівае, што ліст Мэкстона і Кука зьяўляецца па сутнасьці толькі «сентыментальным заклікам». «Аднак, зазначана ў заяве, гэты ліст характарны, як першае адкрытае выступленьне, якое сьведчыць пра раскол у радах парляманцкае фракцыі рабочае партыі. Гэты першы крок павінен адчыніць барацьбу, у іншым разе ён выкліча бясслаўнае паражэньне. Мэкстон і яго таварышы павінны выразна сказаць, куды ідуць ангельская рабочая партыя і генэральная рада, а таксама азнаёміць сьвет з тымі палітычнымі прынцыпамі, якія яны прапануюць ангельскай рабочай клясе.

Нельга дапусьціць, каб Мэкстон і яго прыхільнікі спынілі свой выбар на другой праграме, чым праграма ангельскае кампартыі.

Высунутая аўтарамі лісту ідэя канфэрэнцый ня можа мець посьпеху бяз удзелу кампартыі. На гэтых канфэрэнцыях павінны быць прапанаваны і ўхвалены рэзалюцыі з выкрываньнем здрадніцтва рэфармістаў, з пэўнымі прапановамі аб вядзеньні рэвалюцыйнае барацьбы.

АЦЭНКА ЛІСТА ПРЭСАЮ.

ЛЁНДАН, 21-6. Друк аддае шмат увагі выступленьню Мэкстона і Кука, якое большасьцю газэт тлумачыцца, як «путч левага крыла рабочае партыі».

Генрадаўцы расколваюць індускі нацыянэрэвалюц. фронт.

ЛЁНДАН, 19-6. Калькуцкая газэта „Форуор“ (афіцыйны орган партыі свараджыстаў) выступае з выкрыцьцём дзейнасьці Пэрселя і Горсуорці ў Індыі.

«Нездаволеныя баявым духам індыйскіх рабочых,—піша газэта,—ангельскія рабочыя лідэры дамагаюцца, каб прафсаюзы спынілі ўсякую сувязь з нацыянальным рухам. Як перадаюць, наконт гэтага дасягнута згода між генэральнаю радаю і лідэрамі індыйскіх прафсаюзаў. У бліжэйшым часе з Англіі будуць пасланы грошы з мэтаю заваяваць індыйскія прафсаюзы, якім будзе пададзена патрабаваньне ня мець нічога супольнага з партыямі нацыянальнага руху».

БУНТ НА АЎСТРАЛІЙСКІМ ПАРАХОДЗЕ.

ЛЁНДАН, 21-6. Як паведамляюць з Колёмбо па Цейлёне, ангельскі крэйсэр атрымаў радыё з вялікага аўстралійскага параходу, які павінен быў прыплыць у Колёмбо. У радыё зазначана, што на параходзе выбухнуў мяцеж і што мяцежнікі пагражаюць спаліць пароход. Патрэбна неадкладная дапамога. Паслана дапаможнае судно з атрадам узброеных матросаў.

Новы старшыня ангельскае палаты вобшчын.

ЛЁНДАН, 20-6. Палата вобшчын адназгодна абрала капітана Фіцроя (дэпутат кансэрватыўнае партыі) пікерам (старшынёю) палаты вобшчын замест Вітлі, які падаўся ў адстаўку.

Нявольнікі капіталу абуджаюцца

ЛЁНДАН, 20-6. Водлуг паведамленьняў з Ёгансбургу (паўднёва-афрыканскі саюз), забастоўка на дымавітных капальнях у Грасфонтэйне пашыраецца. Лік бастуючых дасягае 20 тысяч рабочых-тубыльцаў. Між належачымі да складу адміністрацыі еўрапейцамі і бастуючымі адбыліся стычкі. 8 еўрапейцаў паранена. Сем'і еўрапейцаў (якія займаюць у гэтым райёне адміністрацыйныя пасады) выяжджаюць з ахопленага забастоўкаю райёну. У райён накіроўваюцца значныя паліцэйскія сілы.

У панскай Польшчы.

ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІЯ ПЕРАМОВЫ.

Як паведамляе польская прэса, 28 чэрвеня ізноў распачынаюцца польска-літоўскія перамовы ў Коўні і ў Варшаве адначасна. У Коўні будуць абгаварвацца справы палітычныя, а ў Варшаве—гаспадарчыя.

У Коўні на чале польскае дэлегацыі будзе Галувко, той самы, які каля месяцу назад быў ужо ў Коўні таксама на чале польскай дэлегацыі. Тады польскую дэлегацыю сустрэлі ў Коўні ня вельмі ветліва. Студэнцтва літоўскае выступіла з дэманстрацыяй, а калі польская дэлегацыя ад'яжджала з Коўні, дык вагон, у якім яна знаходзілася, быў закіданы яйкамі.

Выпады проці савецкага консульства ў Львове.

ВАРШАВА, 21-6. «Газэта Варшавска» зьмясьціла 17-га чэрвеня артыкул пад загалоўкам «Небясьпечная ўстанова», поўны грубых выпадаў проці савецкага кольсульства ў Львове. Між іншым, газэта зазначае на, нібыта, дапушчаную консулам СССР у Львове Лапчынскім «бестактоўнасьць», якая выявілася ў тым, што ён павесіў у сваім прыёмным пакоі партрэты... Шаўчэнкі і Франка і «даказаў гэтым сваю прыхільнасьць да украінцаў».

Падрыхтоўка Польшчай адказу на ноту т. Чычэрына.

Як паведамляе «Газэта Поранна» № 114 за 19-6 1928 г., рыхтуецца адказ на ноту т. Чычэрына і на будучым тыдні гэты адказ мае быць перададзены праз польскага пасла ў Маскве—Патэка ўраду СССР.

ПАСЬЛЯНАСЬЦЬ ГАНДЛЁВАГА БАЛЯНСУ.

Паводле афіцыйных польскіх статыстычных даных, у маі месяцы вывезена тавараў на 201776000 злотых, а ўвезена на 296470000 злотых. Увоз перавышае экспарт на 94694000, або на нашыя грошы, каля 25 мілёнаў рублёў.

Пасыўнасьць гандлёвага балянсу ў Польшчы назіраецца ўжо на працягу амаль году.

АГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА БУДАЎНІЧЫХ РАБОЧЫХ.

У сераду 20 чэрвеня будаўнічыя рабочыя пастанавілі абвясьціць агульную забастоўку.

Так званыя польскія сацыялісты, як заўсёды, здрадзілі і заявілі, што яны баставаць ня будуць і задавальняюцца тымі абяцанкамі, якія ім далі падрадчыкі і ўласьнікі. Паліцыя ўжыла захады, каб падтрымаць штрэйкбрэхераў, ППС у сьціслай злучанасьці з паліцыяй мяркуе сарваць забастоўку.

ПАДВЫШАЕЦЦА ПЭНСІЯ КСЯНДЗАМ У ПОЛЬШЧЫ.

19 чэрвеня савет міністраў Польшчы пастанавіў падвысіць жалаваньне каталіцкім ксяндзам усіх рангаў—на 22 с полов ай проц.

На выплату жалаваньня каталіцкаму духавенству да гэтай пары траціцца з дзяржаўных сродкаў каля 6 мілёнаў рублёў на нашыя грошы. Цяпер польскі ўрад, ня пытаючыся згоды сойму, як гэтага вымагае канстытуцыя—издараваў чорным груганом каля паўтары мін. руб.

Урад польскі пад прымусам сойму згадзіўся надаўна на падвышку жалаваньня служачым толькі на 15 проц., а ксяндзам самавольна даў амаль удвайне, бо ксяндзы гэта адна з апошніх падпорак гібеючага капіталізму.

ЧАРГОВАЯ КАНФІСКАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ГАЗЭТЫ.

У Вільні канфіскавана беларуская газэта «Зара Працы» № 4 за 13 чэрвеня. Матыў канфіскацыі—зьмяшчэньне дэкларацыі Беларускае сялянска-рабочае фракцыі ў сойме і «шэраг вестак нязгодных на думку ўлады,—з праўдаю».

Відаць справа была зусім наадварот: вельмі многа бясспрэчна праўдзівых вестак было ў газэце, а праўда яе, видома, у вочы коле.

ЧЫГУНАЧНАЯ КАТАСТРОФА.

МАСКВА, 21-6. 21-га чэрвеня раніцою на Маскоўска-Курскай чыгунцы між станцыямі Сьвінская і Таруская пацярпеў крушэньне поезд № 6 Севастопальскі, які ішоў з поўдню ў Маскву. Поезд з хуткасьцю да 80 кілёмэтраў у гадзіну пра. скочыў выходны сэмафор, зьбіў чырвоны сыгнал, які загароджваў месца праны на каляіне, і зышоў а рэйк на тым месцы, дзе зьменьваліся шпалы. Цягнік папсаваны. Сур'язна папсаваны 4 вагоны: багажны, паштовы, пасажырскі і мяккі. З пасажыраў 4 забіта, 9 цяжка паранена і 4 лёгка.

Відзецца дазнаньне прычын катастрофы. Машыніст заявіў, што тормаз быў папсаваны.

Гаміндан разьядаецца крызісам

Нічога супольнага між масамі і генэрал-„правадырамі“.

ШАНХАЙ, 21-6. У газэтах ізноў зьмяшчаюцца паведамленьні аб непаразуменьнях у Гамінданэ. Зьезд Гаміндану праз увесь час адкладаецца, бо ня выключана магчымасьць, што большасьць дэлегатаў будуць камуністы ці спачуваючыя. Галоўныя пасады ва ўрадзе заняты людзьмі, якія не ўваходзяць у Гаміндан. Больш таго, ёсьць погляд, што важныя дзяржаўныя пасады трэба аддаць ворагам Гаміндану.

«Сінь-Вэнь-Бао» паведамляе, што на неафіцыйнай нарадзе ўплывовых сяброў Гаміндану і ўраду большасьць выказалася проці скліку партыйнага зьезду.

Пекін перайменаваны ў Бэйпін.

ШАНХАЙ, 21-6. Нанкінскі ўрад перайменаваў Пекін у Бэйпін, што азначае «паўночны мір», а правінцыю Чжылі у Хобей, што азначае «на «поўнач ад рэчкі Жаўтаг».

Горад Бэйпін будзе галоўным горадам правінцыі Хобэй.

ХТО ВІНАВАТЫ Ў ЗАМАХУ НА ЧЖАН-ЦЗО-ЛІНА.

ПЕКІН, 20-6. Паведамляюць, што ранейшы міністр шляхаў пекінскага ўраду генэрал Чан-Ці-Кай і загадчык цягніковым дэпо Пекін-Мукдэнскае чыгункі Сунь-Хун-Чжэн арыштаваны па абвінавачаньні ва ўдзеле ў замаху на поезд Чжан-Цзо-Ліна.

ЗГАВОР НАНКІНСКІХ «РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ» З КНЯЗЬКАМІ МАНГОЛІІ.

ПЭКІН. 21-6. Японскі орган, які выходзіць у Цянцьзіне, паведамляе, што сябры Гаміндану Бай-Юн-Ці і Цын-Юн-Чжан, па даручэньні Нанкінскага ўраду, устанавілі сувязь з мангольскімі князьямі, каб абмерквацаць пытаньне наконт арганізацыі ўрадавага апарату ва ўнутранай Манголіі. 15-га чэрвеня пры ўдзеле прадстаўніоў шэрагу райёнаў унутранае Манголіі і князёў адбылося пасяджэньне, на якім ухвалена арганізаваць урад унутранае Манголіі ў Далазоры.

ШАНХАЙСКІЯ ШОЎКАПРАМЫСЛОЎЦЫ ІДУЦЬ НА ЎСТУПКІ.

ШАНХАЙ, 21-6. Забастоўка рабочых шанхайскіх поўкапрадзільняў ня спыняецца. Прадпрыёмцы заявілі аб сваёй гатоўнасьці перадаць упарадкаваньне пытаньня аб выплаце за час забастоўкі, а таксама аб зволеных працаўніках—мясцовай уладзе і Гаміндану, але пасьля скančэньня забастоўкі. Газэты думаюць, што 23-га чэрвеня стачка скончыцца.

Нобіле просіць паратунку.

РЫМ, 22-6. Агенцтва Стэфані паведамляе: „Нобіле перадаў, што ён і яго таварышы з хваляваньнем сачылі за палётам лётніка Мадалены. Некалькі пакетаў кідаючыся ападаваліся з прычыны няспраўнасьці парашуту, які не адчыніўся. У зьвязку з гэтым Нобіле просіць перасласць яму другія акумулятары. Далей, ён раіць пасласць некалькі італьянскіх самалётаў, а таксама самалёт з палазамі, які паспрабаваў-бы зьнізіцца на лёд і забраць аднаго за другім удзельніцаў групы Нобіле. Як толькі яго станцыя будзе працаваць нармальна, дык ён перадасьць парады наконт мэтадаў адшуканьня групы, якая засталася з дырыжаблем.

Паведамленьне Нобіле было рантам перарвана, бо густы туман ахутаў Кінзбэй.»

На выратаваньне Нобіле.

ПЕРШАЯ ПАВЕТРАНАЯ РАЗЬВЕДКА З «МАЛЫГІНА».

ЛЁДАКОЛ „МАЛЫГІН“. 21-6. 21-га чэрвеня а 11-й гадз. „Малыгін“ опынуўся ля лёдавага поля, на якое опушчан самалёт. Праз 5 гадзін зборка будзе скончана. 22-га чэрвеня раніцою Бабушкін з бортмэханікам Грошавым выляціць у першую паветраную разьведку на зямлю караля Карла, дзе будзе арганізавана прамежная база з гаручым. Як лёд пачне раставаць і сходзіць на поўнач, «Малыгін» будзе пасоўвацца на поўнач да мысу Лі-Сьміт, каб забраць з леду Нобіле і другую групу.

ЛЁС ЧАСТКІ ЭКІПАЖУ «ІТАЛІЯ» НЕВЯДОМЫ.

ОСЛО, 20-6. У Кінзбэі пачынаюць непакоіцца пра лёс тае часткі экспэдыцыі Нобіле, якая пайшла пешкі ў напрамку на Шпіцбэрген, бо ля ўзьбярэжжа Шпіцбергену зьявіўся сьвежы лёд. Як кажуць лётнікі, нават лёдакол ня здолее прайсьці праз гэты лёд, пакуль яго не паколе бура.

ПРАПАЎ САМАЛЁТ З АМУНДСЭНАМ.

ПАРЫЖ, 21-6. Марское міністэрства даручыла паслаць на Шпіцбэрген крэйсэр „Страсбург“ на адшуканьне лётніка Гільбо, які на апараце «Латам» вылецеў з Амундсэнам і Гебрыксэнам шукаць Нобіле.

ПАГРОЗА ВЯЛІЗНАГА НЕЎРАДЖАЮ Ў ЛАТВІІ І ЛІТВЕ.

Паведамляюць з Рыгі (Латвія), што Латвіі пагражае даволі значны недарод. Дажджы павымывалі значную частку засеву, якія, дзякуючы няспрыяючаму надвор'ю і так былі звыш 50 проц. горшымі ад нармальных.

У Літве назіраецца такое-ж становішча.

КРУЧКАТВОРСТВА У ФРАНЦУСКАЙ ПАЛАЦЕ.

АД Т.Т. КЛЯМАМЮСА І МЭМЭТР'Е АДАБРАНЫ ДЭПУТАЦКІЯ МАНДАТЫ.

ПАРЫЖ, 21-6. Агенцтва Гаваса паведамляе: „Мандатная камісія палаты скасавала абраньне Клямамюса (камуніста) у другой выбарчай акрузе Сэн-Дэні (аколіца Парыжу) і абвясьціла абраным незалежнага радыкала Рэно.

Камісія таксама скасавала абраньне ў Пюто (аколіца Парыжу) Мэмэтр'е (камуніст) які зараз адбывае ў астрозе зьняволеньне, як абвінавачаны ў шпіянажы“.

УВАГА: У другой выбарчай акрузе Сэн-Дэні камуніст Клямамюс атрымаў 13.350 галасоў, а Рэно, які выступаў на выбарах, як рэспубліканскі сацыялёст,—13.349 галасоў. Прыхільнікі Рэно падалі ў камісію па праверцы выбараў заяву, у якой зазначалі на няправільнасьць падліку галасоў. Камісія заявіла, што знайшла няправільнасьці пры галасаваньні, і перадала пытаньне на разгляд палаты.

РАДЫКАЛЫ ПАТРАБУЮЦЬ ПЕРАВЫБАРАЎ.

ПАРЫЖ, 21-6. Фэдэрацыя радыкальнае партыі ў Пюто (аколіца Парыжу) агаласіла пратэст проці пастановы мандатнае камісіі скасаваць мандант камуніста Мэмэтр'е і перадаць мандант кандыдату рэспубліканска-дэмакратычнага саюзу (правая буржуазная партыя) Готэру. Фэдэрацыя патрабуе назначыць перавыбары.

ПАСЬЛЯ НАПАДУ НА ДЭПУТАТАЎ ПАРТЫІ РАДЗІЧА.

ХВАЛЯ ПРАТЭСТАЎ ВА ЎСЁЙ ХАРВАТЫІ

ВЕНА, 21-6. Югаслаўскі ўрад на надзвычайным пасяджэньні ўхваліў перадаць справу ўдзельнікаў стрэляніны ў парляманцкі зьвычайнаму суду.

Рада міністраў зганьбіла ўчынак страмўшага і выказала спачуваньне сялянска-дэмакратычнай апазыцыі. Аднак, сялянска-дэмакратычная апазыцыя адаслана назад ліст з выказам спачуваньня. Выпушчанае сялянска-дэмакратычнай апазыцыяй паведамленьне абвінавачвае ўрад у арганізацыі замаху. Апроч таго, апазыцыя пратэстуе проці таго, што блізні да ўраду друк асьвятляе замах у надзвычайна стрыманым тоне.

У Загрэбе паведамленьне пра страляніну ў скупшчыне выклікала непакой сярод жыхарства. Прадпрыёмствы і грамадзкія месцы былі зачынены. У шмат-ніх райёнах гораду адбыліся дэманстрацыі. Увечары здарылася стычка між паліцыяй і дэманстрантамі. Вуліцы і грамадзкія памяшканьні заняты войскам. Сяляне з аколіць Загрэбу намераны прысьці ў горад і наладзіць там дэманстрацыю. У зьвязку з гэтым урад загадаў зачыніць галоўныя шляхі ў горад.

Грэцыя на асадным становішчы.

Да забастоўкі далучаюцца новыя сілы.

ВЕНА, 21-6. Усе паведамленьні аўстрыйскага друку з Атэн кажуць пра далейшае распаўсюджаньне забастоўкі. Учора да забастоўкі далучыліся рабочыя тытунёвых фабрык у Ляміа і Пірэі, рабочыя атэнскае падзёмнае чыгункі і рабочыя атэнскіх пякарняў. Дзяржаўныя служачыя падалі ультыматыўнае патрабаваньне, абмежаваўшы адказ тэрмінам у 48 гадзін.

Крамы ў Македоніі і Фракіі вярбуюць штрэйкбрэхераў сярод беспрацоўных. Штрэйкбрэхеры ахоўваюцца войскам з прычыны чаго шмат дзе здарыліся стычкі між бастуючымі і войскам. У Салоніках і ў македонскіх гарадох, як перадаюць, уведзена асаднае становішча.

Пад пятой польскага фашызму.

Тры месяцы цягнулася камэдыя суду польскага фашызму над Грамадою і скончылася драконаўскім прысудам, па якім галоўныя абвінавачаныя—паслы польскага сойму Тарашкевіч, Мятла, Рак-Міхайлоўскі і Валошын—засуджаны на 12 год катаргі кожны, а рэшта 33 падсудных — на катаргу ад 3 да 9 год кожны. Зараз-жа пасьля прысуду частка засуджаных вывезена ў выдатны польскі асяродак зьдзекаў і мук—Сьвента-Крыжаўскую турму, за скасаваньне якой ужо даўно выказалася сойм.мавая камісія па справах каторгаў. Іншыя асуджаныя вывезены на катаргу ў Вронкі, на другім баку Польшчы. Такім чынам, фашысцкая ўлада да драконаўскага прысуду дадала новую рэпрэсію — кінула засуджаных у найстрашнейшыя вастрожныя норы Польшчы і гэтым пазбавіла іх матчымасьці мець які-небудзь кантакт са сваякамі.

37 абвінавачаных прыгавораны агулам на 209 гадоў катаргі толькі на той падставе, што яны былі членамі легальнай 100-тысячнай арганізацыі беларускіх рабочых і сялян. Тут трэба падкрэсьліць, што ўсе абвінавачаньні, якія інкрымінаваліся грамадаўцам, адносяцца да часу перад разгонам Грамады (арыштаваны яны былі ў студзені 1927 г., і толькі ў сакавіку таго-ж году зьявілася ўрадавае паведамленьне, якім Грамада прызнавалася за нелегальную арганізацыю). На справе пракуратура спрабавала давесьці, што абвінавачаныя зьяўляюцца дзяржаўнымі здраднікамі і шпіёнамі, але на падмацаваньне сваіх закідаў не змагла дастасаваць ніякіх фактаў, апрача спрочных довадаў правакатараў.

209 гадоў катаргі за прыналежнасьць да легальнай арганізацыі беларускіх рабочых і сялян—сымбал сёньнешняй фашысцкай Польшчы, тэй буржуазнай Пальшчы, якая зьяўляецца адной вялікай вастрожнай камэрай для рабочых, сялян і прыгнечаных народаў. 209 гадоў катаргі ў працэсе Грамады—гэта адначасова довад таго, што ніякімі рэпрэсіямі, тэрорам, і ўціскам, нават самымі адборнымі сродкамі з фашысцкага арсэналу, Пілсудскаму ня ўдасца зламаць барацьбу працоўных мас Заходняй Беларусі і Украіны за грамадзкае і народнае вызваленьне.

Працэс Грамады кідае яскравы прамень на нацыялітыку польскага фашызму. Польская буржуазія на чале з урадам Пілсудзкага ўмела праводзіць імпэрыялістычную палітыку, спрабуючы, аднак, замаскіраваць яе байкамі пра вольнасьць. У 1919 г. войска Пілсудзкага, насучы зьнішчэньне і няволю беларускім і украінскім землям, несьлі сьцягі з выпісанымі на іх старымі лёзунгамі паўстаньня 1830 г.—«за нашу і вашу вольнасьць!» Цэлы шэраг гадоў на акупаваных польскім імпэрыялізмам тэрыторыях Беларусі і Украіны адбывалася самаволя польскай бюракратыі: уціскаліся рабочыя украінцы і сяляне-беларусы, на землі украінскіх і беларускіх сялян пасылаліся асадзікі--палякі з афіцэраў і падафіцэраў арміі Пілсудзкага, зьнішчалася школьная справа прыгнечаных народаў і за астрожныя сьцены ваганяліся тысячы рабочых і сялян.

Пасьля фашысцкага перавароту, у сувязі з шырокімі антысавецкімі плянамі, урад Пілсудзкага пачаў «урэгуляваньне» справы нацменшасьцяй. Украінскай і беларускай буржуазеі польскі фашызм кінуў астаткі з панскага стала ў выглядзе субвэнцыі для банкаў і парцэляцыйных таварыстваў, у форме ўрадавых пасад для «прыхільных інародцаў», а рабочым і сялянам Украіны і Беларусі паказаў узброены кулак польскага фашызму. Урад Пілсудзкага прынёс працоўным масам гэтых акупаваных земляў крывавыя расправы, доўгі ланцуг масавых палітычных працэсаў, пры дапамозе якога фашызм хоча аблытаць і задушыць вызваленчы рух. У 1926-27 г. хваля вялікіх палітычных працэсаў перш за ўсё пракацілася па заходня-украінскіх землях. Досыць успомніць толькі вялізарны працэс 151 ва Уладзіміры Валынскім, які скончыўся прысудам абвінавачаных агулам больш як на 1000 год катаргі, працэс 67 у Луцку, масавыя працэсы ў Львове, Ковелі, Стрыю, Холме, Замосьці, Берасьці, Каламеі, Чарткове і г. д. Яшчэ ня скончыліся палітычныя працэсы ў Львове і Чарткове, як фашысцкі ўрад першым працэсам Грамады распачаў сэрыю працэсаў, якія на лаўцы падсудных трымаюць амаль што ўсю Заходнюю Беларусь. Цяпер адбыўся ў Беластоку працэс 120 рабочых і сялян, укінутых у турму пад маскай абвінавачаньня іх у прыналежнасьці да камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Гэты працэс яшчэ з першых дзён высьветліў вобраз гвалтаў і зьдзекаў над зьняволенымі ў норах дэфэнзывы. Пракуратура сьпешна рыхтуе далейшыя расправы над [illegible]ямі Грамады. Сотні беларускіх сялян за кратамі казэматаў чакаюць на панскую «справядлівасьць» польскага фашызму.

Атака ўраду Пілсудзкага на вызваленчы рух працоўных мас Заходняй Беларусі і Украіны мае заданьне ня толькі здрадзіць фальваркі абшарніцкія і капіталістычную маснасьць ад паходу сацыяльнай рэвалюцыі. Яна ёсьць ня толькі праяваю польскага нацыяналізму, які праводзіць палітыку палёнізацыі так званых «красаў». Спрабуючы разграміць вызваленчы рух у Заходняй Украіне і Беларусі польскі імпэрыялізм хоча ачысьціць поле для будучай вайны супроць СССР. Працэс Грамады, працэс 126 у Беластоку—гэта толькі часткі таго ланцуга ваенных падрыхтаваньняў, які куецца ў кузьні Чэмбарленаў, Пілсудзкіх і Мусаліні.

Паны імпэрыялісты, аднак, памыляліся ў сваіх плянах. На гвалты фашызму працоўныя масы Заходняй Беларусі і Украіны, а таксама цэлай Польшчы, адказалі аддачаю каля мільёну галасоў за сьпісы рэвалюцыйнага анты-фашысцкага рабоча-сялянскага блёку. Урад распачаў працэс Грамады ў часе выбараў у сойм, каб вастрэйшыць рабочых і сялян Заходняй Беларусі. 70 тысяч галасоў, адданых у Лідзкім павеце—за скасаваны сьпіс Грамады, 73 тысячы галасоў, сабраных сьпісам Грамады ў Новагрудзкім павеце—гэта дэманстрацыя салідарнасьці шырокіх працоўных мас Заходняй Беларусі з укінутымі за астрожныя краты правадырамі беларускага вызваленчага руху, гэта праява волі мас да сталай барацьбы з польскім фашызмам і імпэрыялізмам.

Драконаўскія прысуды ў працэсе Грамады і 126 буд

Справа шахцінскіх контр-рэвалюцыянэраў.

Дапытваюцца нямецкія падданыя Отто і Майер.

Отто—шпіён і фашыст.

МАСКВА, 21-6. Цэнтральная частка раённага пасяджэньня суду па шахцінскай справе 21-га чэрвеня прысьвечана допыту падсуднага Отто. Отто—нямецкі падданы, інжынэр фірмы АЭГ, які прыехаў у СССР для ўстаноўкі набытае ад яго фірмы для аднаго з донецкіх рудникоў турбіны—абвінавачваецца ў сувязі з контр-рэвалюцыйнай арганізацыяй, між іншым, у дапамозе заснаваньню зносін між яе харкаўскім цэнтрам і Бэрлінам.

Отто дасканала гаворыць нарасейску. У Расеі ён жыў у працягу з 1896 да 1906 г., а потым у перыяд 1914 да 1918 году. Бацька яго быў дырэктарам аднае з буйных праслаўскіх мануфактураў.

На прапанову Вышынскага ахарактарызаваць свае палітычныя погляды і партыйную прыналежнасьць, Отто паведамляе, што ён ні да якое партыі не належыць, але член фашысцкае арганізацыі „Сталёвы Шлем", у якой заставаўся аж да дню арышту. Побач з членствам у «Сталёвым Шлеме» Отто схітраваў увайсьці ў члены „Таварыства прыяцеляў новае Расеі", не паведаміўшы таварыству, уступаючы ў яго, што ён член «Сталёвага Шлему». Між тым, у статуце таварыства гаворыцца, што член фашысцкае арганізацыі ня можа быць яго членам. Статуту яму „не паказвалі". Выяжджаючы, аднак, у Расею, ён захапіў сяброўскі білет таварыства прыяцеляў, каб водлуг слоў Отто „у выпадку патрэбы пасьведчыць свае прыяцельскія адносіны да СССР".

Крыленка апытвае падсуднага і выяўляе, што Отто жыў у Расеі хлопчыкам, потым выехаў у Нямеччыну і ўжо юнаком вярнуўся ў Расею ў красавіку 1914 г. і ў часе вайны вёў працу па шпіёнажы.

Выкананьне шкодніцкіх даручэньняў.

У далейшым Отто перадае, што пры выезьдзе з Бэрліну ў СССР улетку 1927 г. бачыўся з Блейманам,—дырэктарам расейскага аддзелу. «Вы едзеце на коксавыя печы, вашая роля—устанавіць, якую там можна правесьці працу"—больш нічога Блейман яму не гаварыў, даручэньняў не даваў. Ён толькі назваў прозьвішчы Рубановіча, Казарынава, Віліка, да якіх па прыезьдзе ён павінен быў зьвярнуцца. Бачыўся таксама і з Башкіным, якога добра ведаў, бо два гады з ім працаваў. Башкін прасіў яго захапіць дажджавы плашч для яго брата Абрама, які служыць на Данбасе. Отто прывёз дажджавы плашч з сабою ў Харкаў і напісаў Башкіну, каб прыслаў каго-небудзь за пасылкаю. Башкін, аднак, да гэтага часу да яго не зьявіўся і ён яго ўпяршыню бачыць на працасе.

Выкліканы на вочную стаўку Башкін гаворыць, што ліст атрымаў, але за плашчам не пасылаў. Водлуг слоў Башкіна, ён неяк раз гутарыў з мандэрам Майерам, якраз калі Майер тлумачыў яму, як трэба папісваць турбіну. Тады ўзьнікла думка, што „можа быць дажджавое палітО ўаўляе сабою які-небудзь шыфр, якую-небудзь канспірацыю". На справе такое канспірацыі ня было. Выяўлнецца, аднак, што на папярэднім сьледзтве Башкін паведаміў, што дажджавы плашч павінен быў сігналізаваць буйнае шкодніцтва. Башкін завярае, што гэта самаардынарная пасылка. Тады ён гаварыў няпраўду. Наогул гэта быў нейкі псыхоз.

Отто завярае, што ніякіх лістоў ня браў, нікому не даваў і не дастаўляў, Казарынава ня ведае і бачыць упяршыню ў судзе, Казарынаў, выкліканы на вочную стаўку катэгарычна завярае, што Отто, прыехаўшы, быў у яго і перадаў яму ліст з Бэрліну і сказаў, што гэта «пошта Матаву».

На шляху найменшага пярэчаньня.

Пасьля допыту падсуднага абаронаю, суд пачынае допыт падсуднага Майера—нямецкага падданага, мандэра фірмы АЭГ, абвінавачваемага ў тым, што ён служыў сувязьзю між берлінскім цэнтрам і харкаўскімі шкоднікамі, а таксама ў тым, што даваў Башкіну парады, як папісваць турбіну на Уласаўскім кіраўніцтве рудникоў.

Майер вінаватым сабе не прызнае. На судзе Майер прытрымліваецца сыстэмы адхіленьня ўсякіх фактаў, выкрываючых яго дачыненьне да шкодніцкае арганізацыі. Між іншым Майер адхіляе, што меў з Башкіным гутарку на тэму аб мэтадах псаваньня турбіны на Уласаўскім кіраўніцтве рудникоў і ў сваіх паказаньнях вельмі часта супярэчыць сабе. Апытаны наконт гэтага падсудны Башкін проста гаворыць, што калі Майер прыехаў на Уласаўку і паказаў Башкіну, якія часткі турбіны зьяўляюцца для Башкіна навінкамі, дык, між іншым, пачаў паказваць, як можна гэтай турбіне пашкодзіць.

Вельмі заблытанымі зьяўляюцца паказаньні Майера адносна знаёмства яго з берлінскім Башкіным.

МАСКВА. На вячэрнім пасяджэньні суду па шахцінскай справе 21 чэрвеня дзяржаўны абвінаўнець Рагінскі закранае пытаньне аб грашох, якія, водлуг слоў Башкіна, прывёз яму Майер. Майер катэгарычна адхіляе гэты факт, завяраючы, што ніякіх грошай Башкіну ад брата ня прывозіў і не перадаваў. Выкліканага Башкін; ён таксама катэгарычна завярае, што Майер прывёз яму з Бэрліну 300 ці 400 р. Адрача Майера, ён атрымаў ячмэ 600 р. ад Вагнера. Абаронна Майера Ворм таксама ўзьнімае гэтае пытаньне аб грашох, адзначаючы супярэчнасьці ў паказаньнях Башкіна на папярэднім сьледзтве і цяпер. Тады Башкін казаў, што атрымаў ад Майера 500 руб. два разы ў сакавіку. Цяпер 300—400 руб. у падвале электрастанцыі. Башкін гаворыць, што атрымаўшы грошы ад Майера, ён іх не пералічыў—Майер сказаў 500 руб, ён і паверыў яму на слова. Грошы сунуў у кішэню, а там былі і іншыя грошы, так што сказаць дакладна ён ня можа, а атрымаў грошы ён, бязумоўна ў падвале электрастанцыі...

Навочная стаўка Башкіна з Майерам у выніку пераварваецца ў паўторны допыт Башкіна, які, галоўным чынам, вядзе прафэсар Ворм, ставячы падсуднаму шэраг запытаньняў, зьвязаных з яго знаёмствам і дачыненьнямі з Майерам. Асаблівая ўвага зьвяртаецца гутарцы ў падвале электрастанцыі, дзе Майер даваў Башкіну настаўленьні аб тым, як папісваць турбіну. Майер паранейшаму адхіляе, што ён даваў якія-небудзь парады шкодніцкага характару, і з свайго боку ставіць Башкіну шэраг запытаньняў, каб устанавіць тэхнічную нянісьменнасьць інжынэра. Удаецца гэта яму кепска. Супярэчнасьці ў сваіх паказаньнях раней і цяпер Башкін тлумачыць сваім хваравітым становішчам. Майера, завяраючага, што ніякіх парад аб тым, як адносіцца да вентыляў Башкіну ён не даваў, улічаюць супярэчнасьці і Вышынскі і Крыленка. Адказваючы на запытаньні Ворма, Башкін, між іншым, завярае, што Майер ня толькі даваў яму парады, як папісваць турбіну, але і наогул радзіў ажыцьцяўляць дробнае шкодніцтва на ўрубовых машынах.

Падсудны Матаў аб асобных стадыях шкодніцтва.

Суд пачынае допыт Матава. Пасьля кароткае і геаграфічнае справкі, Матаў пераходзіць да агульнага абрысу заснаваньня і разьвіцьця контр-рэвалюцыйнае арганізацыі. Часам заснаваньня арганізацыі Матаў называе 1924 г. ды гэта была толькі сувязь з ранейшымі ўласьнікамі і інжынэрамі, эміграваўшымі заграніцу, між іншым з Дваржанчыкам. Між іншым, ячмэ ў 1924 г. Матаў вёў гутаркі з інжынэрам Быхоўскім і перадаваў яму розныя весткі аб становішчы працы на Данбасе. Быхоўскі да гэтага часу паўтара гады быў заграніцаю і там бачыўся з Дваржанчыкам. Матаў коратка паўтарае ўжо паведамлены падсудным Сушчэўскім эпізод, як быў атрыман у 1924 г. ліст ад Дваржанчыка разам з яго інструкцыяй ня толькі адносна пасылкі вестак інфармацыйнага характару, але і адносна шкодных чынаасьці на рудніках. Матаў лічыць 1924 год пачаткам арганізацыі сваёй шкодніцкай. У гэтым годзе было некалькі парад членаў арганізацыі, адна з якіх адносілася на кватэры Бахтыярава. Пачынючы з 1925 году, сувязь, якая была з Дваржанчыкам, але за якім адчувалася і руда ранейшых уласьнікаў і прамыслоўцаў, перэтварэецца ў сувязь з бюро ранейшага „газету зьезду горнапрамыслоўцаў поўнай Расеі», якое да таго часу было арганізавана ў Донвугалі. Ядро арганізацыі на Данбасе, якое складалася ўпачатку з некалькіх асоб, пачало павялічвацца праз увядзеньне шэрагу новых зьезду як у самым Донвугалі, так і на пэрыферыі. У ліку арганізацыйных пытаньняў, вырашаных у працягу 1925 г. стаіць пытаньне аб заўладаньні арганізацыяй усіх апаратаў. На адной з нарад арганізацыі была ўхвалена пастанова, каб заўладаньне апаратам было больш глыбокае, чымся раней. Потым у тым-жа годзе было пастаноўлена выкарыстаць камандыроўкі заграніцу інжынэраў для ўзмацненьня сувязі з заграничнай арганізацыяй. У гэтым-жа годзе пачаў праводзіцца арганізавана шэраг шкодніцкіх учынкаў, між іншым у галіне дробнага шахцінскага будаўніцтва.

1926 год быў працягам працы арганізацыі, але былі ўнесены некаторыя зьмены, а ўласна [illegible] некаторых вестак у Харкаве і сувязь з маскоўскім цэнтрам. Маскоўскі цэнтр пачынае хутка разгортвацца. У сярэдзіне гэтага-ж году была заснавана і матар'яльная сувязь з нямецкімі фірмамі. Даручэньне аб заснаваньні больш шчыльнае сувязі з заграніцаю атрымаў Матаў, які тады накіроўваўся ў камандыроўку ў Нямеччыну.

Чаму Японія ўзводзіць паклёп.

Японскія газэты, якія выходзяць у паўночным Кітаі, выкідаюць каламуты вадаспад бясспэнсна-фальшывых выдумак аб палітыцы СССР. Тут і 12 (аж 12!) савецкіх дывізій, „тэрмінова пасунутых на мяжу Манчжурыі" (краёвая паўночная частка Кітаю). Тут і «папярэджаньні» аб небясьпецы «савецкага гвалтоўнага ўваходу» ў Манчжурыю. Тут і паведамленьні з белагвардзейскіх крыніц (знашлі «надзейную» падставу!) пра намер СССР захапіць Усходнія-Кітайскую чыгунку, якая праходзіць праз Паўночную Манчжурыю.

Зразумела, што ўсё гэта выразная выдумка. Аднак, недарэчны паклёп на СССР недарэчна хлынуў на старонкі японскага друку. У японскім паклёпе ёсьць пэўны палітычны сэнс. Яго—гэты сэнс — выявіць няпяжка, калі ўспомніць, што процісавецкія выступленьні японскага друку ў Паўночным Кітаі распачаліся на другі дзень пасьля вядомага выбуху поезду Чжан-Цзо-Ліна.

У гэты дзень японскія газэты апавясьцілі сваіх чытачоў пра 2-х «падавроных» кітайцаў, якія нібыта бадзяліся па чыгунцы пасьля выбуху і былі заколаты японскаю вартаю, а таксама аб тым, што ў кішэнях гэтых кітайцаў былі зчойдзены асколкі бомб, нібыта „савецкага паходжаньня".

Далей асколкі абернуты былі на старонках газэт у ручныя гранаты, таксама, зразумела, «савецкай вытворчасьці». Але гэта саўсім не зрабіла больш праўдзівым фальшывага японскага «тлумачэньня» прычыны выбуху.

Выбухнуць два вагоны поезду на поўным ходзе ручнымі гранатамі ці бомбамі, якія зьмяшчаюцца ў кішэні! Які дурань гэтаму паверыць! Нават ангельскія газэты, якія на ўсе бакі выхваляюць рабаўнічую палітыку Японіі ў Кітаі, і тыя паведамляюць, што вагон Чжан-Цзо-Ліна быў выбухнуты **дынамітнаю мінаю вагою ў 5 з паловаю пудоў** і што выбух быў падрыхтаваны сапёрамі. Ангельскі друк, праўда, ня кажа, што **сапёры былі японскія.** Але гэта і так зразумела. Ніякіх іншых сапёраў у райёне чыгункі, якая ўзмоцнена вартуецца японскім войскам, **быць не магло.**

І вось якраз для таго, каб хоць чым-небудзь захаваць гэты выразны факт, каб хоць крыху адцягнуць ад яго ўсеагульную ўвагу, і распаўсюджваецца казка пра гранаты «савецкага паходжаньня».

Няцяжка пераканацца, што такое-ж значэньне мае і другая японская казка—пра савецкія захватныя пляны ў Манчжурыі. Яна таксама апавядаецца толькі для таго, каб хоць як-небудзь утаіць падрыхтоўку ажыцьцяўленьня **сапраўдных, а ня выдуманых** японскіх захватных плянаў у Манчжурыі.

Што іменна рыхтуецца зрабіць Японія,—яшчэ незразумела. Магчыма, што яе пляны яшчэ ня зусім афармліліся. Але бясспрэчна, што Японія хоча выкарыстаць сучаснае фармальнае аб'яднаньне Кітаю пад уладаю панкінскага ўраду для таго, каб канчаткова абярнуць Манчжурыю ў сваю калёнію.

Фармальнае аб'яднаньне Кітаю мае і дрэнны і добры бок для Японіі. З аднаго боку яна баіцца нават бачнасьці кітайскага аб'яднаньня. Яна заўсёды імкнулася стаць папярок дарогі ўсіх спроб кітайскіх палітыкаў да аб'яднаньня. **З гэтага пункту гледжаньня сучаснае становішча ў Кітаі зьяўляецца сур'ёзным параджэньнем японскай палітыкі.**

Але з другога боку, паколькі панкінскі ўрад пакуль-што аб'яднае ўвесь Кітай, **апроч Манчжурыі,** куды адступіла разьбітае войска Чжан-Цзо-Ліна, паколькі **перад Японіяй паўстае часовая, зразумела, але больш шырокая, чымся раней, магчымасьць гаспадараньня ў манчжурскіх межах,—пастолькі для японскіх захватчыкаў сама па сабе напрашваецца спроба аддзяліць Манчжурыю ад рэшты Кітаю.**

Як вядома, такая спроба была ўжо аднойчы зроблена Японіяй. Гады два назад Чжан-Цзо-Лін, які быў тады яшчэ вернаю служкаю японскага ўраду, абвясьціў Манчжурыю незалежнаю ад Кітаю. Распачалася ўжо нават арганізацыя манчжурскага ўраду. Між іншым, было ўжо амаль што сфармавана міністэрства замежных спраў.

Але хутка Чжан-Цзо-Лін сам загубіў гэтую справу. У пачатку 1927 г. яго войска заняло Пекін і ваколічныя райёны паўночнага Кітаю, **якія знаходзяцца за межамі Манчжурыі.** Абсталяваўшыся ў Пекіне ды яшчэ да таго-ж зрабіўшы спробу пасунуцца ў сярэдні Кітай, Чжан-Цзо-Лін ізноў зьвязаў лёс Манчжурыі з лёсам іншага Кітаю, і манчжурская «незалежнасьць» была нават проста запамятавана.

Японія, зразумела, была вельмі незадоволена гэтаю няўдачаю сваіх манчжурскіх плянаў. Ня дзіва, што яна супярэчыла (бяз посьпеху) проці выступленьня чжан-чзо-лінаўскага войска за межы Манчжурыі (пачатак 1927 г.) Ня дзіва, што яна не перашкодзіла панкінскаму войску выгнаць Чжан-Цзо-Ліна з Пекіну і нават сама, пушчаючы ў ход пагрозы, імкнулася прымусіць яго хутчэй выйсьці назад у Манчжурыю. Ня дзіва, нарэшце, што яна надумалася пры дапамозе выбуху „ліквідаваць" свайго ня досыць паслухмянага служку.

Памёр Чжан-Цзо-Лін ад ран у часе выбуху, ці яшчэ жыве,—пакуль што невядома. Але калі і жыве, дык і ён і ўся група манчжурскіх (чжан-цзо-лінаўскіх) генэралаў знаходзяцца зараз у поўнай залежнасьці ад Японіі. Толькі Японія можа перашкодзіць панкінскаму войску саўсім ліквідаваць разьбітае войска Чжан-Цзо-Ліна і заняць Манчжурыю. Японія нават ня лічыць патрэбным утойваць, што яна зьяўляецца зараз сапраўдным гаспадаром Манчжурыі.

Японскі друк адкрыта піша, што японскі ўрад «ужо ня можа абмежавацца адною толькі абаронаю японцаў, якія жывуць у Манчжурыі». А галава японскага ўраду Танака гэтымі днямі зноў заявіў, што **«Японія недапусьціць непакою ў Манчжурыю,»** г. зн., што Японія намерана сама ўпарадкаваць лёс гэтай кітайскай вобласьці. Магчыма, што ў першую чаргу яна паўторыць спробу адлучыць Манчжурыю ад Кітаю.

Згодна некаторых вестак, яна хоча зрабіць гэта ў форме абвяшчэньня незалежнай манчжурскай манархіі. Намечаны Манчжурскім «манархам» ранейшы кітайскі імператар Пу-І (скінуты ў 1911 годзе, калі была скінута манархія ў Кітаі) быў-бы, зразумела, толькі агентам японскага ўраду, **а яго «манархія» зрабілася-б канчаткова японскай калёніяй.**

Магчыма, што гэты плян не зьяўляецца сур'ёзным, хоць зразумела «імператар» недарэмна выехаў у Манчжурыю. Магчыма, што будзе зроблена спроба абвясьціць манчжурыю незалежнаю і бяз ніякага «манарха».

Чжан-Цзо-Ліна, які за апошні час выкаваў некаторую няўпэўненасьць, Японія ня лічыць адпаведным для гэтага. Яна для таго і «ліквідавала» яго, каб зрабіць манчжурскім кіраўніком іншага генэрала.

Вельмі магчыма, што гэтым новым кіраўніком Манчжурыі (нават калі Чжан-Цзо-Лін і жыве) будзе генэрал Ян-Ю-Цін, начальнік штабу чжан-цзо-лінаўскай арміі, вядомы сваею сувязьзю з японскім урадам...

Такія, прыблізна пляны Японіі. Мо' яны пацерпяць няўдачу. Ня выключана магчымасьць, што Японія, урэшце і не адважыцца на адкрытае адлучэньне Манчжурыі ад Кітаю.

Але рабаўнічы характар японскіх намераў выразны. І яго не ўтаіць ніякімі басьнямі, ніякаю маною пра СССР.

І. С.

Вялікі пажар у Самаркандзе.

САМАРКАНД, 21-6. 20-га чэрвеня а 4-й гадз. раніцы на станцыі Самарканд здарыўся вялікі пажар. Згарэла—крытая плятформа, 10 нагружаных таварных вагонаў, 2 парожніх і 1 пасажырскі. Згарэўшы груз—крамніна, цукер, чай і жалезныя вырабы. Страты—блізка 500 тысяч рублёў.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

На шлях калектывізацыі.

(Да акруговага зьезду калгасаў Магілеўшчыны).

МІНУЛЫ ГОД—ГОД УЗМАЦНЕНЬНЯ КАЛГАСАЎ.—У ПЫТАНЬНЯХ НАКАПЛЕНЬНЯ КАПІТАЛУ І РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ДАХОДАЎ КАЛГАСЫ СТАЛІ НА ВЕРНЫ ШЛЯХ.—АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАНЬНІ ЗЬЕЗДУ.

Магілеў, 22-6. 24 чэрвеня адкрыецца першы акруговы зьезд калгасаў. Ад кожнага калгасу як старога, так і нова арганізаванага прыедзе прадстаўнік.

Перш за ўсё трэба зазначыць на буйны рост новых калгасаў. Ужо зараз зацьверджаны статуты 68 новых калгасаў, а да канца земляўпарадкавальнага сэзону лік калгасаў утрая перавысіць меркаваныя пляны. Наогул, **за год лік калгасаў падвоіцца.**

Гаворачы аб старых калгасах, неабходна падкрэсьліць, што тая ўвага, якая зварочвалася ў апошнія часы на калгасы, дала свае вынікі.

За год калгасы ўзмацніліся значна. На 75 процантаў калгасы перайшлі ўжо **на шпатпольле.** Пасеў канюшыны складае па розных відах аб'яднаньняў ад 14 да 25 процантаў пасеўнае плошчы, бульбы—ад 13 да 19 процантаў. Ня так добра з пасевам ільну.

Вельмі значна вырасла за год **прадукцыйнае жывёлаводзтва.** Гэтак, па камунах лік кароў на кожныя 100 дзесяцін павялічыўся з 16 да 22, на арцелях—з 23 да 30. Даход ад жывёлагадоўлі складаў у сярэднім 15 процантаў агульнага прыбытку,—павялічыўся супроць папярэдняга году на 20-25 проц.

Машынная тэхніка—трактары, малатарні, снапавязалкі, касаркі і жаткі ўжо не навіна ў нашых калгасах.

Калі параўнаць індывідуальную сялянскую гаспадарку з калектыўнай, дык убачым такія красамоўныя лічбы на карысьць апошняй. **Сярэдні гадавы даход на аднаго працаўніка ў камунах складае 648 рублёў,** у арцелях—435 рублёў і ў таварыствах—206 рублёў. Як далёка паасобная сялянская гаспадарка ад гэтых лічбаў! Гэткі даход можа даць толькі калектыўная, буйная калектыўная гаспадарка.

Калі да пералічаных посьпехаў дадаць, што далейшая дапамога калгасам ва ўсіх выглядах забясьпечана (крэдыт ужо цяпер даходзіць да 450 руб. на сям'ю, для ўсіх калгасаў складзены вытворчыя пляны, яны забясьпечваюцца машынамі, насеньнем і штучным угнаеньнем цалкам, агранамія ў першую чаргу дапамагае калгасам), дык можна сказаць, што калгасы знаходзяцца **на пэўным шляху свайго разьвіцьця.** Такія-ж самыя добрыя пэрспэктывы маюць і нова арганізаваныя калгасы.

Акруговы зьезд дапаможа калгасам у іх далейшым разьвіцьці і росквіце.

Пільную ўвагу зьезд аддасьць пытаньням складаньня і накапленьня **капіталаў** у калгасах. На гэтай найважнейшай справе, якая складае падмурак калектыўнага жыцьця, ужо была завойстрана ўвага калгасаў у апошнія часы. На зьезьдзе яна павінна знайсьці сваё яскравае вырашэньне, а потым—і належнае выкананьне.

Пытаньне аб **агранамічным абслугоўваньні** калгасаў зойме належнае месца ў работах зьезду. Пакуль-што ў кожным райёне вылучан адзін агранам для працы выключна ў калгасах. Але гэтага зусім мала, асабліва прымаючы пад увагу новыя калгасы, якія патрабуюць шмат да сябе ўвагі. Пакуль-што трэба імкнуцца да павялічэньня ліку аграномаў, якія вылучаюцца на калгасную працу. А далейшы шлях месьцівца, бязумоўна, у тым, што павінна быць арганізавана **ўласная гнездавая калгасная агранамія.** Гэты правільны шлях ужо пашчупалі дзьве райённыя нарады калгасаў, якія ўхвалілі запрасіць аграномаў за кошт калгасаў.

Нарэшце, зьезд абгаворыць і шэраг іншых пытаньняў. У прыватнасьці, аб арганізацыйным абслугоўваньні калгасаў (у акрузе—сэкцыя сельгассаюзу альбо саюз калгасаў, на мясцох—гнездавыя аб'яднаньні), аб узбуйненьні калгасаў, аб сувязі з зямельнымі органамі і каапэрацыяй на мясцох, аб каапэрацыйна-асьветнай працы і інш.

Кв'к.

Нарада па перасеву ярыны.

Ніводзін гэктар пашкоджанае плошчы ў райёне не павінен заставацца не перасеяным.

Гомель, 22-6. Пры акрпляне адбылася нарада па пытаньні аб мерапрыёмствах па перасеву пашкоджанай плошчаў. З атрыманых матар'ялаў райёнаў відаць, што ў бягучым годзе разьмер пашкоджаньня азімых пасеваў ад вымачак значна вышэй звычайнага—2-3 проц.

Яравыя пасевы, водлуг папярэдніх даных, пашкоджаны на плошчы да 3-х тысяч дзесяцін, найбольшы разьмер пашкоджаньняў маецца ў Рэчыцкім райёне.

У сучасны момант пачаты перасеў пашкоджаных плошчаў. На абсеяньне іх прызначана загатовіць у акрузе і арганізаваць завоз да 6 тысяч пудоў грэчкі і каля 1000 пудоў вікі.

Для больш хуткага забясьпечаньня райёнаў, адчуваючых патрэбу ў грэчцы, прапанавана хлебазагатоўчым арганізацыям забраніраваць для перасеву наліччa насеньня грэчкі, якое маецца на базах і ў нізавой сетцы. Райвыканкомам прапанавана ўжыць самыя рашучыя захады, каб ніводзін гэктар пашкоджанае плошчы ў райёне не заставаўся не перасеяным.

Палессельсаюзу прапанавана тэрміново перакінуць у Рэчыцкі райён 50 процантаў загатоўленае ім на Украіне вікі. Сельска-гаспадарчаму банку даручана забясьпечыць нізавую сетку крэдытамі для загатоўкі насеньня грэчкі і вікі для перасеву.

На барацьбу са шкоднікамі.

Смалявічы. У вёсцы Верхмень арганізаваўся атрад для барацьбы са шкоднікамі гародаў і садоў. Атрадам кіруе мясцовы агранам. Атрад мае два апрысківаецелі: адзін ручны, другі конны. У выпадку масавага паяўленьня шкоднікаў у тэй ці іншай вёсцы атрад будзе выяжджаць на месца.

Адсеў ярыны.

Ворша, 20-6. У сувязі з дрэннай вясеньняй пагодай шмат усходаў было змыта, частка ніў пусьцее з прычыны няўсходжасьці насеньня. Належнымі органамі прыняты меры да абсеяньня гэтых палёў, адпушчана 6 тысяч пуд. насеньня вікі са складаў Акрсельсаюзу.

Да дню вызваленьня ад белапалякаў.

Барысаў, 21-6. Барысаўскі гарадзкі камітэт МОПР'у 11-га ліпеня (дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў) будзе праводзіць скарбоначны збор у карысьць замежных рэвалюцыянэраў.

З вясковых лістоў

— «Пашырае сваю працу Лельчыцкая каапэрацыя (Мазырскай акругі). Калі пачалі зачыняцца прыватныя крамы, усе клапаціліся, ці зможа каапэратыў задавальняць насельніцтва таварамі.

Цяпер адчыніліся 2 каапэрацыйныя крамы—адна ў мястэчку, а другая—у цэнтры Стадоліцкага с.-с. Павялічылася ўжо колькасьць пайшчыкаў і тавару па іх хапае больш, як раней».

Фінкель Ш.

— Трэба суняць хуліганаў у сяле Царкоўчі, Прыборскага с.-с., Рагачоўскага р-ну (Бабруйшчына) Лявонава Пятра і Муфірава Мікалая,—піша селькор «Несвабоды».

Мала таго, што яны п'янай лаянкай разагналі сход сялян, дык яшчэ зьбілі да паўсьмерці гр-на Патапа Луфрава, а пастаўніца, якая праводзіла сход, чуць уцякла ад гэтых „ваяк". Хто паможа супакоіць шкоднікаў?

— Дзень лесу прайшоў надта добра ў в. Нівок, Уэдзенскага р-ну (Меншчына); агульным удзелам грамадзкіх арганізацый у ліку каля 50 чал. было пасаджана 1,5 гэктара лесу.

„Удзельнік".

— «Чырвоная Вона» паведамляе, што ў Бялынкавічах (Касьцюковіцкі р-н, Магілеўшчына) усю вуліцу заграмазьдзілі бярвеньнем і жыхарам вёскі ня можна прайсьці на пошту.

Кампанія ў разгары.

У нашым райёне цяпер ідзе напружаная праца па вучоту аб'ектаў ападаткаваньня. На трох сельсаветах ужо зроблен часткова вучот і праверка. Праверачнымі камісіямі выкрыта каля 300 дзес. пахаці, 200 сьвіней, 100 авец і 50 кароў. Уся цяжкасьць па выяўленьні зямлі ў тым, што неабходна абмяраць сялянскія надзелы, а спэцыялістых мала прыцягнута да гэтай працы. Усяго нярэдка выявіць па райёну 5500 дзес. пахаці, 1200 дзес. сенажаці, 4500 кароў, 1700 коняй, 7000 сьвіней, што і будзе выяўлена пры належнай працаздольнасьці вучотных і праверачных камісій. Неабходна адзначыць, што некаторыя сельсаветы, як, напрыклад, **Курганскі** з вучотам зусім кепска спраўляецца. Сельская праверачная камісія не працуе па віне старшыні с-савету, які не дае зьвестак аб утоеных адзінках ападаткаваньня. Азяранскі сельсавет ужо правёў вучот, а праверкі не рабіў ні разу і ўтоеных аб'ектаў ня выкрыты. У Дварэцкім с-с., у в. в. Пілікавічах і Падзейкавічах ёсьць утоенай зямлі па 200-300 дзес., а праверачная камісія і ня ведае аб ёй, бо ня хоча быць «ворагам» сялянства.

Самы лепшы напрамак працы ўзяў В-Крушынаўскі с.-с. Пасьля вучоту па паселішчу ён падлічвае вынікі і калі заўважае зьмяншэньне аб'ектаў, у параўнаньні з мінулым годам, дык вучотная і праверачная камісія далей да працы вучоту ня прыступае пакуль ня выкрые ўтаёнышчыкаў. Да падхопаў трэба адносіць слабую арганізаванасьць бедноты, якая мала дапамагае выяўленьню ўтоеных аб'ектаў ападаткаваньня. На ўсе выяўленыя аб'екты складзены пратаколы, на якіх наложаны штрафы ў разьмеры ад 5 да 25 руб. Аддасьца пад суд член В-Крушынаўскага сельсавету **Арцёмаў Павал,** які сам памагаў утойваць аб'екты. Праца разгарнулася ва ўсю, трэба толькі больш увагі к ёй з боку РВК, тады заданьне па выяўленьні будзе выканана поўнасьцю.

Я. Крушына.

Рагачоўскі р-н, Бабруйшчына.

Падрыхтоўка да Міжнароднага Дню Каапэрацыі.

ГОМЕЛЬ, 22-6. Каапэрацыйныя арганізацыі акругі пачалі падрыхтоўку да Міжнароднага Дню Каапэрацыі. Ва ўсіх селішчах будуць праводзіцца гутаркі па каапэрацыйных пытаньнях. У буйных каапэрацыйных арганізацыях будуць выпушчаны насьценныя газэты, прысьвечаныя Дню Каапэрацыі, адчынены куткі «Маці і Дзіця», гарбатні і інш.

Узмацненьне загатовак.

Гомель, 22-6. Загатоўкі за 10 дзён чэрвеня месяца паказалі некаторае павялічэньне па ўсіх асноўных відах сыравіны і хлебапрадуктаў. Загатоўлена сельска-гаспадарчае сыравіны на 85007 р. Асобнымі загатоўчымі арганізацыямі загатоўлена: Палессельсаюзам—на 9959 руб., Гомрайсаюзам—38768 р., Белдзяржгандлем—24965 р., іншымі—11315 р. Хлебных прадуктаў загатоўлена — 80,76 тон.

Да Шостага Кангрэсу Камінтэрну.

Значэньне праграмы Камінтэрну.

У студзені гэтага году мінула 80 гадоў ад часу агалашэньня камуністычнага маніфэсту Маркса і Энгельса. У гэты час узьнікненьня навуковага камунізму, капіталізм, апрача Англіі і Францыі, быў яшчэ ў самым зародку, а пралетарыят быў слабым у пераважнай большасьці, зусім несьвядомым, пражываючым у барбарстве, якое панавала было яму капіталізмам, клясай. Патрэбны быў увесь гэні, уся цьвёрдасьць навуковых пераканаваньняў і застраты думкі такога чалавека, як Маркс, каб здолець прадказаць будучае вялізарнае разьвіцьцё капіталізму і зазначыць, яшчэ неабуджанаму да клясавае сьвядомасьці, пралетарыяту, яго вялікую гістарычную задачу.

Камуністычны маніфэст,—гэта праца, якая яшчэ і зараз разглядаецца яго адкрытымі буржуазнымі і замаскаванымі „сацыялістычнымі" ворагамі як нейкая ўтопія—можна параўнаць з вэрамаднай пабудовай, вялізарным будынкам, ніжэйшыя паверхі якога моцна стаяць на зямлі, ужо апрацаваныя доказамі і цэглаю, у той час, як сталёвы касьцяк яго верхніх паверхаў, які здаецца такім слабым і ня трывалым, але ў сапраўднасьці магутны і правільна разьлічаны цягнецца да воблакаў, чакаючы канчатковае дабудовы.

Разьвіцьцё капіталізму і буржуазнае грамады з 1848 году шмат зьмяніла ў тым часе ў праекце пабудовы. Маркс і Энгельс самі ўносілі зьмены ў ня праект, і шмат пасьвелі пабудаваць. Але ў агульнай канструкцыі разьвіцьця буржуазнага ладу, як яна акрэсьлена ў камуністычным маніфэсьце і ў больш позьніх працах яго аўтараў, нішто ня зьменена. Капіталізм і буржуазны лад прайшлі свой шлях уверх і цяпер ужо ідуць па дарозе ўніз, як гэта прадбачылі Маркс і Энгельс. Гісторыя нічога не паслабіла з іх прадказаньняў адносна росквіту і краху капіталізму і буржуазеі, наадварот, яна шмат узмацніла і падкрэсьліла.

Сучасны рабочы рух, пралетарская рэвалюцыя іншы па шляху, прадказаному камуністычным маніфэстам. Гэты шлях аказаўся больш доўгім і цяжкім, чымся хацела і магла прызнаць гэтая праграма „саюзу камуністаў" папярэдні рэвалюцыі 1848 году. Марксу і Энгельсу прышлося даведацца аб гэтым самім па вопыце. Калі першы міжнародны камуністычны саюз пасьля канчатковага разгрому рэвалюцыі 1848 году спыніў сваё існаваньне, яны змаглі ўжыць новую спробу стварэньня міжнароднае арганізацыі пралетарыяту толькі ў 1867 годзе, і пры гэтым ім прышлося пачынаць працу ў зусім іншых умовах і гаварыць больш умеранай мовай. Але ўжо першы рэвалюцыйны выбух гэтае другое эпохі міжнароднага рабочага руху Парыская Камуна 1871 году павінна была зрабіцца канцом гэтае эпохі. За адважным выступленьнем пасьледавала параджэньне, якое азначала канец І-га Інтэрнацыянялу.

Другі Інтэрнацыянал прынёс з сабою такі ўздым міжнароднага рабочага руху, што здавалася, перамога пралетарыяту недалёка. Але распуста часткі пралетарыяту ад недаедкаў са стала імпэрыялізму і здрада лідэраў, якія абапіраліся на гэтую частку пралетарыяту, прывялі II-гі Інтэрнацыянал да развалу ў той момант, калі сусьветная вайна стварыла аб'ектыўныя прадпасылкі для перамогі пралетарыяту ў значнай частцы капіталістычнага сьвету.

Аднак, расейскі Кастрычнік выратаваў справы рэвалюцыі, і даказаўшы, што II-гі Інтэрнацыянал спыніў сваё існаваньне, як Інтэрнацыянал пралетарскі, заснаваў III-ці Камуністычны Інтэрнацыянал, які вядзе пачатую Марксам і Энгельсам 80 гадоў таму назад справу, пад кіраўніцтвам расейскага пралетарыяту да пераможнага канца.

Ужо мінула больш 10-ці гадоў з моманту захопу ўлады пралетарыятам у Расеі і ўжо амаль 10-ць гадоў існуе III-ці Інтэрнацыянал. Гэта былі годы цяжкае барацьбы, цяжкае працы, але і адначасна годы ачысткі ўласных шэрагаў. Пасьля вайны і грамадзянскае вайны, праз вайсковы камунізм і першы пэрыяд НЭП'у пралетарыят Савецкага Саюзу перайшоў, перамогшы адначасна трацкізм, да поўнае яснасьці ў справе сацыялістычнага будаўніцтва ў духу ленінізму.

За межамі Савецкага Саюзу наглядалася, вельмі часта сярод суровых, набываючых разьмер грамадзянскае вайны боек, поўнае адмежаваньне рэвалюцыйнага авангарду пралетарыяту ад сацыял-дэмакратыі, і арганізацыя масавых камуністычных партый, якім, у наступныя гады іх самастойнага існаваньня, удалося, пад кіраўніцтвам Камінтэрну, зьнішчыць заст

УСЕ НА БАРАЦЬБУ З СУХОТАМІ.

З 22-га па 24 чэрвеня г. г. Нар. Кам. Аховы Здароўя праводзіць па ўсёй БССР сухотны трохдзёньнік. У гэтыя дні кожны працоўны павінен успомніць, праверыць, што ён зрабіў для барацьбы з сухотамі, як ён дапамог дзяржаве ў справе вызваленьня ад гэтай жудаснай хваробы, якая калечыць меладое жыцьцё, вырывае з шэрагу рабочае клясы і сялянства так патрэбную для будаўніцтва народнай гаспадаркі рабочую сілу.

Мы занадта звыкліся з сухотамі, яны сталі ў нас звычайным зьявішчам, а таму мы часта забываемся пра тую грозную небясьпеку, пра тыя цяжкія вынікі, якія нясе з сабой гэта жудасная хвароба—спадчына навольніцтва, эканамічнага ўціску і культурнай адсталасьці.

У Беларусі штогод памірае ад сухотаў прыблізна каля 12.000 чал. А колькі з застаўшыхся ў жывых застаюцца інвалідамі. Колькасьць згубіўных працаздольнасьць ад сухотаў, бязумоўна, вялікая і лік іх перавышае лік памёршых.

Дарма думаюць многія, што сухоты ня так небясьпечная хвароба па свайму заражэньню, як іншыя інфэкцыі. Гэта толькі так здаецца. Таксама, як пляміты тыфус, воспа—сухоты лёгка перадаюцца ад хворага да здаровага і, бязумоўна, вялікія заразьлівай хваробай.

Праўда, у адзнаку ад іншых заразьлівых хваробаў, сухоты падкрадваюцца паволі, напрыкметна і не адразу выяўляюць сваю руйнуючую чыннасьць. Але затое раз пачаўшыся, яны пачынаюць упарта падтачваць сілы чалавека, і калі ня прыняты своечасова меры, дык захварэўшы назаўсёды выводзіцца з строю.

Сухоты—хвароба масавая, цэлага калектыву, бо яна падта заразьлівая і цалком залежыць ад умоў быту, у якіх жыве чалавек.

Ніводная хвароба гэтак наяўна не залежыць ад быту, як сухоты. Тут на кожным кроку можна назіраць, як малейшая драбніца—адсутнасьць санітарных навыкаў, некультурнае ў санітарным сэнсе жыцьцё—балюча б'е па чалавеку і зараз-жа дае аб сабе ведаць праз развіцьцё сухотнага працэсу.

Сухоты баяцца сонца, чыстага паветра, добрага харчаваньня. Там, дзе чалавек жыве ў душнай хаце, якая не праветрываецца, як гэта часта можна бачыць у беларускага селяніна, калі хата вільготная і цёмная, напоўсутарэннага тыну, калі паветра ў пакоі мала і, урэшце, калі прыходзіцца недаядаць,—усё гэта разам узятае,—лепшыя падыходзячыя ўмовы, каб сухотнаму мікробу моцна, грунтоўна замацавацца ў чалавечым арганізьме.

Вось чаму цяпер, калі ўся наша краіна савецкая перажывае палацу лікарадачнага жыльлёвага будаўніцтва, калі партыя абвясьціла лёзунг аб культурнай рэвалюцыі — неабходна ўважлівей падыйсьці да пытаньняў санітарнага дабрабыту нашага жыцьця.

Барацьба за фортку, сьветлае, прасторнае памяшканьне для жыльля, добра арганізаванае грамадзкае харчаваньне, добрыя ўмовы працы—вось нашы патрабаваньні, якія павінны завастрацца ў часе правядзеньня сухотнага трохдзёньніку.

Сухотны трохдзёньнік тым і важны, што ён павінен сканцэнтраваць увагу ўсёй савецкай грамадзкасьці вакол пытаньняў быту, выкрыць недахопы гэтага быту, паказаць прычыну распаўсюджваньня сухотаў і даць прасьцейшыя парады дзеля зьнішчэньня нашых санітарных хібаў.

Трэба заўсёды памятаць, што сухоты—глыбокая сацыяльна-бытавая хвароба, што барацьба з ёй можа весьціся не праз аптэку і лякарствы, а толькі праз аздараўленьне нашае працы і быту.

Чым хутчэй рабочыя і сяляне здолеюць нерабудаваць свой быт на сацыялістычны лад, бо камунізм—гэта найвышэйшая форма культуры,—тым хутчэй адыйдзе ад нас здань цяжкага мінулага, хвароба нявольнікаў—сухоты.

М. БАРСУКОЎ.

Нашы дасягненьні ў справе барацьбы з сухотамі.

Зьмяншэньне сьмяротнасьці ад сухотаў у Менску.

Дзякуючы санітарным мерапрыёмствам, якія прымаюцца органамі Аховы Здароўя ў справе барацьбы з сухотамі, сьмяротнасьць ад сухотаў па г. Менску падае з году ў год.

Так, у 1922 годзе ў Менску памерла ад сухотаў 311 чал., у 1923 г.—355 чал., у 1924 г.—367 чал., у 1925 г.—224 чал., у 1926 г.—190 чал. і ў 1927 г.—152 чал.

Рост супроцьсухотных устаноў па БССР.

За апошнія гады наглядаецца шпаркі ўзрост супроцьсухотных устаноў па БССР.

Так, калі да Кастрычніковай рэвалюцыі па БССР налічвалася ўсяго 2—3 аддзяленьні лігі барацьбы з сухотамі, якія праводзілі сваю працу праз невялічкія амбуляторыі, дык зараз мы маем наступную колькасьць супроцьсухотных устаноў па БССР: 12 сухотных дыспансэраў з 136 ложкамі пры іх, 5 сухотных пунктаў, 8 начных стацыянараў-санаторы з 153 ложкамі, 1 сухотны санаторы на 80 ложак для дарослых, 2 сухотных санаторыя на 125 ложак для дзяцей, 110 сухотных ложкаў пры бальніцах і дзьтычную сталоўку на 145 пайкоў. У хуткім часе павінен разгарнуць сваю працу Дзяржаўны Сухотны Інстытут, які будзе кіраваць усёй справай барацьбы з сухотамі па БССР.

Праца Менскага сухотнага дыспансэру ў лічбах.

Менскі сухотны дыспансэр мае вялікія дасягненьні.

Так, калі ў 1922 г. менскі сухотны дыспансэр наведала 3.171 чал., дык ужо ў 1923 г. наведала 7.966 чал., у 1924 г.—15.192 чал., у 1925 г.—25.668 чал., у 1926 г.—29.749 чал. і ў 1927 г.—30.000 чал. Апроч таго, сухотным дыспансэрам зроблена абсьледаваньне па дамох: у 1923-24 г.—650 чал., у 1925 г.—1.152 чал., у 1926 г.—2078 чал. і ў 1927 г.—5.568 чал.

Сьмяротнасьць ад сухот зьменшылася.

(З працы магілеўскага сухотнага дыспансэру).

МАГІЛЕЎ, 20-6. З вясны пры дыспансэры адкрыты начны санаторы на 15 чалавек. Дагэтуль праз санаторы прапушчана 31 чалавек. Хворыя прыходзяць у санаторы а пятай гадзіне па поўдні, пасьля работы, і застаюцца ў ім да сёмай гадзіны раніцы, калі яны уходзяць на сваю звычайную работу. Хворыя маюць добрыя харчы, вясной і летам ўвесь час знаходзяцца на сьвежым паветры (сьпяць на верандзе). Дзякуючы ўсяму гэтаму, хворыя добра папраўляюцца.

Такі ж самы санаторы (таксама на 15 чалавек) працуе ў рабочым цэнтры акругі —Шклове.

Усяго зараз лечацца і знаходзяцца пад наглядам магілеўскага сухотнага дыспансэру па гораду Магілеву (без акругі) 1379 чалавек. Гэта значыць, каля 2,8 процантаў насельніцтва гораду.

Апрыяя лячэбнай працы, дыспансэр разгарнуў даволі значную санітарна-асьветную працу. За год зроблена каля 500 наведваньняў у хату хворых. У тых выпадках, калі ў аднаго члена сям'і выяўляецца адкрытая форма хваробы, выклікаюцца да агляду ўсе члены сям'і.

Праведзенае дыспансэрам вывучэньне захворваньняў і сьмяротнасьці ад сухот па гораду Магілеву выявіла, што за тры гады сьмяротнасьць зьнізілася з 17,7 да 13,5 чалавек на тысячу насельніцтва. Гата зьніжэньне падае на дзіцячы ўзрост (зьніжэньне ва ўзросьце да аднаго году—удвая), пры стабільнасьці сьмяротнасьці серод дарослых і паказвае, што хворыя на сухоты больш абвядома ставяць у адносінах да членаў сваёй сям'і,—у прыватнасьці да дзяцей.

К-ВІЧ.

КАНЦЭЛЯРСКАЯ АДПІСКА.

Аб няўважлівых адносінах да селькораўскіх лістоў.

Ужо не аднойчы пісалася ў газэтах, як некаторыя ўстановы доўгі час марынуюць селькораўскія заметкі, калі яны пасылаюцца рэдакцыяй на расьсьледаваньне, фармальна адносяцца да выкрытых фактаў, а то і проста губляюць лісты.

Прыклады. Напісаў нам селькор аб брыдкіх адносінах настаўніка 2-й Пятрыкоўскай сямёхгодкі да вучняў, якіх ён сілай выкідаў з клясы, зьнімаў шапкі з галоў і кідаў на падлогу і заяўляў, што «калі-б не савецкія законы, я-б з вамі іначай паступаў».

Як-жа РВК расьсьледваў гэту справу? Справа расьсьледвалася цэлы год, і толькі пасьля напамінаньня газэты «С. Б.» і пракуратуры аб заціжцы, заметка зьвернута з тлумачэньнем загадчыка сямёхгодкі. Райвыканком у затрыманьні заметкі апраўдваецца тым, што загадчык культспраў прызван мінулай восенью ў шэрагі Чырвонай арміі, і заметку ён ня здаў свайму намесьніку, а яна знойдзена ў старых паперах.

Можна згадзіцца нават, што такі непрадугледжаны выпадак здарыўся з РВК, але-ж ён паказальны, як асобны член РВК аднёсся да найбліжэйшай па яго галіне справы і таго-ж селькораўскага ліста.

Тлумачэньне загадчыка сямёхгодкі фактаў робіць яго падобным на чалавека, які ходзіць па дроце—«балансіруе ў паветры». Вось яго словы: «Карэспандэнцыя ў значнай частцы не адпавядае сапраўднасьці». (Чалавек абвяргае). „Выпадкаў ужываньня фізычнага завьдзеньня ў адносінах да вучняў з боку выкладчыка Марозава, як зазначана ў карэспандэнцыі, ня было. Што датычыцца выпадкаў некарэктнага павядзеньня ў адносінах да вучняў, то яны мелі месца".

Далей ідзе апавяданьне, як школьная рада «своячасова» разглядала гэта пытаньне і хацела атрымаць ад Марозава адказы, але справа зацягнулася, бо Марозаў захварэў, быў у больніцы: гэта перашкодзіла высьветліць справу. Потым Марозаў наведваў школу і з прычыны хворасьці і нэрвовасьці ў яго вынікалі нетактычныя адносіны. (Гэта значыць, нейкія другія нетактычнасьці, а ня тыя, аб якіх піша селькор Д.).

Як школьная рада магла канкрэтна вырашаць пытаньне, мы можам уявіць сабе з наступнага факту. Калі ў канцы навучальнага году па настойлівасьці камсамольскага калектыву зноў закраналася гэта пытаньне, настаўнікі казалі: „Марозаў праў", «Марозаў добра робіць». (Гэта факт, ці паклёп вучняў на Марозава і ўсіх настаўнікаў, ці ўсіх настаўнікаў на Марозава? Д.).

Вынікі аб тым, наколькі добра расьсьледвана заметка, вельмі выразны. Трэба ці ня трэба было пытацца ў вучняў—таго-ж камсамольскага калектыву школы і самога Марозава аб сапраўднасьці паданых у заметцы фактаў, РВК не падумаў. Фармальныя адносіны в боку апошняга да заметкі сказаліся цалкам. Балячка засталася ня вырашанай.

Другая заметка, пад назвай «Цёмныя справы», была паслана летась рэдакцыяй, у жніўні м-цы, амаль адначасова з вышэйпаданаю таксама на расьсьледваньне і недзе зусім загінула ў цемры таго-ж Пятрыкоўскага РВК. Цяпер, амаль праз год, РВК просіць адбітак заметкі. Ды праз год можа страціць усялякае значэньне і сьлед найцямнейшая справа.

Другі прыклад фармальных адносін Каралінскага РВК тэй-жа акругі. У заметцы «Аграномія шуціць» селькор даводзіць, як райаграном Шыбайла няўважліва адносіцца да пасеўкампаніі. Калі яго Савет ТДА-Авіяхіму просіць зрабіць даклад на агульным сходзе аб плянах пасеўкампаніі, дык ён думае, што гэта жарты і думкі аб заклады паказальных вучасткаў са штучнымі ўгнаеньнямі для яго таксама зьяўляюцца жартамі.

Райвыканком замест наведамленьня аб тым, якія захады ўжыты ў выніку расьсьледваньня «жартаў агранома», толькі зазначыў: «факт, зьмешчаны ў заметцы, пацьвярджаецца».

Яшчэ лепш робіць Капыльскі РВК. У допісе «Хэўра» селькор піша аб злоўжываньнях Пясочанскага с.-г. т-ва, якое „кормны авёс вясной прадавала за насенны, купляла сьвіней, а потым валаводзіла сялян з выплатай грошай па 3-4 тыдні. Старшыня праўленьня т-ва—былы гандляр сьвіньнямі. Гэтым займаўся да 1927 году. Бухгальтар—стары архівэр, зубатычнік, бюракрат вымэйшай маркі, якому, што ілюнуць, выставіць селяніна за парог. Упаўнаважаны па закупцы сьвіней з цёмным мінулым і вельмі ласы на хабары. За вясеньнія злачынствы аднаму члену праўленьня далі 5 гадоў умоўна, а за зьдзек над сялянамі, ды падрыў аўтарытэту с.-г. каапэрацыі ў вачох сялянства, заключае селькор, уцёршымся злачынцам трэба даць па 5 гадоў з суровым адмежаваньнем».

Міліцыя займалася расьсьледваньнем заметкі. У пратаколе допыту старшыня Пясочанскага с.-с. пацьвярджае: 1) навыплату грошай сялянам с.-г. т-вам за купленыя ў 1927 г. сьвіньні, 2) выпадкі выкрыкаў з боку бухгальтара і старшыні на сялян і 3) што сучасны старшыня праўленьня—былы гандляр сьвіньнямі.

Хоць аб аўсу і іншых даных допісу нічога не паказана ў пратаколе, аднак слабенькае пацьверджаньне старшыні с.-с., правідловей абарона «хэўры», сьведчыць аб наяўнасьці недарэчнасьцяй у т-ве, якія трэба было дасканала высьветліць і паведаміць рэдакцыю аб сутнасьці справы.

Старшы міліцыянэр 11-га райёну тав. Прохарчык абмежаваўся толькі допытам старшыні с.-с. і на падставе кароткага пацьверджаньня апошнім фактаў, якія прыведзены вышэй, піша пастанову, што „факты, адзначаныя ў заметцы „Хэўра", **не пацьвердзіліся**, а па гэтаму ён ўхваліў справу навіраваць сьледчаму на спыненьне».

Капыльскі РВК, ня гледзячы на наяўную супярэчнасьць **«зварочвае допіс з вытвараным дазнаньнем, па якому факты не пацьвердзіліся»**. Вынікі даволі „красамоўныя". Што можна дадаць да такога нядбайства?

Трэба, каб з гэтых прыкладаў належныя ўстановы ня толькі направілі паказаныя памылкі, але каб нарэшце скончыліся нячулыя адносіны да лістоў селькораў і выкрытых шкодніцкіх фактаў і недахопаў, з якімі селькоры дапамагаюць змагацца.

Гэта змаганьне не павінна фармальнымі адносінамі зводзіцца ў нічто.

Д—к.

На дарожнае будаўніцтва сёлета будзе затрачана 1.458.000 руб.

Сёлета на будаўніцтва дарог мясцовага значэньня адпушчана 1.458.000 руб. і апрача таго маркуецца на 221.000 руб. выканаць работу сіламі самога насельніцтва.

З гэтай сумы 1,175.603 руб. вызначана на будаўніцтва дарог акруговага значэньня і пад'язных шляхоў к чыгуначным станцыям і пераходным прыстаням. За кошт райённага бюджэту будзе весьціся рамонт і пабудова невялікіх мастоў і рамонт дарог райённага значэньня,—на ўсе гэтыя работы з агульнай сумы асыгнавана 247.132 руб. Апрача таго, адпушчана 36.000 руб. на дапамогу сялянству пры рамонце дарог сельскага значэньня.

ШТО-Ж СЁЛЕТА БУДЗЕ БУДАВАЦЦА І БУДУЕЦЦА?

Трэба сказаць, што ў бягучым годзе будзе праведзена досыць вялікая работа па прывядзеньні ў парадак нашых дарог і мастоў, а таксама і па новаму будаўніцтву апошніх.

Так, па дарогах акруговага значэньня будзе праведзен бягучы рамонт мастоў на агульным працяжэньні ў 9932 пог. мэтраў і звыш 1100 кілёмэтраў дарог. Разам з тым будзе праведзен капітальны рамонт 20 мастоў, 9 бэтонных труб і 14,5 кілёмэтраў дарог. Апрача таго, будзе пабудавана 361 новых мастоў, 291 жалеза-бэтон. труб і 55 лёдарэзаў да існуючых мастоў. Прадугледжваецца пабудова новай насыпі на дарогах (156480 куб. мэтраў), узмацненьне адкосаў на існуючых і будучых дарогах і шэраг іншых работ.

З больш буйных работ трэба адзначыць брукаваньне шляху Гарадок—Глуск на 6,5 кілёмэтраў, Магілеў—Чавусы—1,5 кілёмэтраў, пабудову маста з дамбай праз р. Сож каля м. Хальчы, пабудову вучастка дарогі Менск—Слуцак (3,5 кілёмэтраў) і інш.

Гаворачы аб дарожным будаўніцтве райённага значэньня, трэба адзначыць, што вялікія масты на райённых і сельскіх дарогах будуць будавацца і рамантавацца за кошт акруговага бюджэту. За рахунак-жа мясцовага бюджэту райвыканкомаў будзе пабудавана 435 новых драўляных мастоў, 14 жалеза-бэтонных труб і 9 лёдарэзаў, пабудова зямельнага палатна, узмацненьне адкосаў і досыць значныя работы па рамонту існуючых мастоў і дарог.

Пры дапамозе самога насельніцтва маркуецца таксама правесьці работу па рамонту непраезджых месц на дарогах сельскага значэньня, дзе будуць рамантавацца і невялікія мосьцікі.

ЯК-ЖА РАЗГОРНУТА НАША ДАРОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА?

Водлуг вестак НКУС да 1-га чэрвеня ўжо скарыстана сродкаў на дарожнае будаўніцтва 64 проц. агульнага асыгнаваньня. Работа, галоўным чынам, выконваецца пакуль што па рамонту і пабудове мастоў,—гэтыя работы вяліся яшчэ і ўзімку. Досыць добра стаіць справа з будаўніцтвам мастоў у Магілеўскай і Полацкай акругах, якія выканалі ўжо больш 80 процантаў гадавога пляну. Горш справа з Меншчынай—выканана 45 проц. пляну, у Гомельшчыне — толькі 20 процантаў, а з Аршаншчыны і Бабруйшчыны даўгуль няма ніякіх зьвестак, і што там робіцца—невядома.

Трэба адзначыць, што рабоце па рамонту дарог увесь час перашкаджае кепскае надвор'е, але ўсё-ж у Магілеўшчыне і Меншчыне выканана ўжо 50—40 проц. гадавога пляну, а ў Гомельшчыне і Полаччыне толькі 10 проц. пляну.

Райённае і сельскае дарожнае будаўніцтва праходзіць больш-менш здавальняюча ў Гомельскай, Магілеўскай і Мазырскай акругах, горш справа ў Меншчыне і Палоччыне, дзе дарожнае будаўніцтве прасоўваецца наперад вельмі слаба.

Такая стракатасьць у разгортваньні дарожнага будаўніцтва па асобных акругах па дарогах акруговага, райённага і асабліва сельскага значэньня сьведчыць аб тым, што ня ўсюды гэтаму пытаньню ўдзяляецца належная ўвага.

Неабходна падумаць адстаючым акругам аб тым, каб больш шырока разгарнуць гэты від будаўніцтва, а сельсаветам ажыцьцявіць усе тыя пастановы, якія прымаліся сялянствам у час правядзеньня кампаніі па самаабкладаньні.

М—чна.

У Савеце Народных Камісараў БССР

(Пасяджэньне 20 чэрвеня).

На гэтым пасяджэньні пад старшынствам Нам. Старшыні СНК т. Карклiна, быў выслуханы даклад Старшыні Мазырскага АВК т. Стрэла аб дзейнасьці АВК і садаклад Народнага Камісара Земляроблства т. Прышчэпава аб умовах землякарыстаньня і земляўпарадкаваньня ў Мазырскай акрузе, а таксама даклад Нам. Народнага Камісара Ўнутраных Спраў і Начальніка Адміністрацыйнага Кіраўніцтва НКУС т. Кроля аб дзейнасьці міліцыі БССР. Для апрацоўкі рэзалюцыі па гэтых дакладах СНК утвораны камісіі.

СНК было таксама разгледжана пытаньне аб узмацненьні мясцовых бюджэтаў БССР. Быў прыняты пададзены НКФ і Дзяржплянам праэкт пастановы ЦВК і СНК БССР аб узмацненьні мясцовых бюджэтаў. Выданьне такой пастановы выклікаецца тым, што мясцовыя бюджэты ня цалкам задавальняюць уласнымі сродкамі неабходныя патрэбы гасцадарчага і культурнага будаўніцтва. Гэты дэфіцыт трэба было пакрываць або простай дапамогаю, або субвэнцыяй мясцоваму бюджэту з дзяржаўнага бюджэту. Практыка мінулых гадоў паказала, што канчатковае зацьверджаньне мясцовых бюджэтаў і разгортваньне вытворчых плянаў па розных галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва падта зацягвалася з прычыны няўпэўнасьці гэтых дапамог. Апроч таго, усякае зьмяншэньне субвэнцый і дапамог пры разглядзе бюджэтаў адбівалася на значным скарачэньні будаўнічых плянаў.

З мэтаю зьнішчэньня гэтых адмоўных зьявішч у мясцовых бюджэтах і ў мясцовай гаспадарцы, СНК прызнаў патрэбным палепшыць становішча мясцовых бюджэтаў узмацненьнем іх сродкаў. Дзеля гэтага, паводле праэкту пастановы, мясцовым саветам дазваляецца спаганяць збор з драўніны ў наступным разьмеры: 5 проц. для дзяржаўных і каапэрацыйных устаноў і прадпрыёмстваў, а таксама для сельскіх рамесьнікаў і саматужнікаў, якія маюць на сваіх прадпрыёмствах набольш 3-х наёмных рабочых і 8 проц. для ўсіх іншых спажыўцоў. Мясцовым саветам таксама дазваляецца спагнаць падатак з грузаў у двайным разьмеры, паводле прадугледжанага палажэньнем аб мясцовых фінансах СССР.

Для павялічэньня даходаў ад камунальных прадпрыёмстваў НКФ разам з НКУС і ВСНГ даручаецца перагледзець сыстэму арганізацыі камунальных прадпрыёмстваў і парадак іх удзелу ў мясцовым бюджэце, устанавіўшы больш высокія нормы гэтага ўдзелу ў параўнаньні з прамысловымі прадпрыемствамі. Пачынаючы з 1928-29 г. мяркуецца ўстанавіць адлічэньні па дзяржаўнаму бюджэту ў 50 проц прыбытку ад гандлёвых прадпрыёмстваў рэспубліканскага значэньня прыбытак ад якіх паступае ў дзяржаўны бюджэт, а таксама мяркуецца перавесьці на дзяржаўны бюджэт, пачынаючы з 1928-29 г. выдаткі на пэнсію інвалідам вайны і іх сем'ям і на бягучы рамонт памяшканьняў Васнведу. НК Унутраных Спраў даручаецца перагледзець сетку дарог мясцовага значэньня, маючы на ўвазе, што ўсе дарогі паміж акруговымі цэнтрамі БССР зьяўляюцца дарогамі дзяржаўнага значэньня і павінны ўтрымліваца па каштарысах НК Шляхаў Зносін.

З прычыны таго, што пабудова памяшканьняў для пачатковых школ і абсталяваньня новых камплектаў згодна пляну ўсеагульнага навучаньня ня можа быць праведзена цалкам за кошт мясцовага бюджэту, прызнана патрэбным, каб 50 проц. патрэбных для гэтага сродкаў, пачынаючы з 1928-29 г., прадугледжваліся па дзяржаўнаму бюджэту.

Пастаноўлена ўзьняць перад вышэйшымі органамі СССР хадайніцтва аб зацьверджаньні некаторых пунктаў гэтай пастановы. НКФ даручаецца падаць у СНК хадайніцтва перад урадам СССР аб прыняцьці на агульнасаюзны бюджэт дапамогі мясцовым бюджэтам на школьнае будаўніцтва і на абсталяваньне школ.

СТАНОВІШЧА ПАСЕВАЎ У БССР.

ЗА АЗІМЫЯ ПАСЕВЫ АПАСКІ НЯМА. СЯРЭДНІ БАЛ ПА БССР—2,6. ГОРШ З ЯРЫНОЙ, У НЕКАТОРЫХ МЯСЦОХ ПАЧАЎСЯ ПЕРАСЕЎ.

Становішча хлебных культур.

Па пяцібальнай сыстэме становішча азімых пасеваў ацэньваецца балам 2,6, якое лічыцца сярэднім. Між тым, летась на гэты дзень стан пасеваў ацэньваўся ў 2,7.

У параўнаньні з данымі, на першае чэрвеня бягучага году к сучаснаму моманту становішча азімых пасеваў крыху палепшылася,—(на 1-УІ было 2,5). Адгэтуль відаць, што, не зважаючы на кепскае надвор'е, азімыя пасевы вытрымалі апошняе досыць добра і нават палепшыліся.

Гэтага нельга сказаць пра пасевы ярыны: калі на 1 чэрвеня ячмень ацэньваўся балам 2,7, дык на 15 чэрвеня ячмень ужо ацэньваецца ў 2,2. Тут сіваваты выключна няспрыяючыя мэтэрэолёгічныя ўмовы. Летась на 15 чэрвеня ячмень таксама ацэньваўся балам 2,2.

Пасевы аўсу на 15 чэрвеня ацэнены ў 2,5 супроць 2,9 на 1 чэрвеня, але ў параўнаньні з мінулым годам маецца некаторае паляпшэньне, бо летась на гэты дзень авёс быў 2,3.

Калі ўзяць азімыя і яравыя пасевы разам, дык сярэдні бал па ўсіх хлебных культурах на 15 чэрвеня будзе 2,5, супроць 2,7 на 1 чэрвеня.

Становішча сенакосаў.

Пасевы канюшыны на 15 чэрвеня ацэньваюцца балам 2,7, заліўныя сенакосы—2,6 і суходольныя—2,8. Увогуле становішча сенажацяў і пасеўных траў уцэлым па БССР вышэй сярэдняга.

Надвор'е ў пэрыяд сяўбы характарызуецца холадам, дажджамі і халоднымі вятрамі. Дажджы зацягвалі самы ход сяўбы і ў некаторых акругах апошняя на першае чэрвеня ня была яшчэ скончана (гэта датычыць Віцебшчыны, Полаччыны і Аршаншчыны).

Дзякуючы вымачцы, зараз у пасобных раёнах неабходна будзе правесьці перасеў як ярыны, так і азімых. Найбольш нізкая балавая ацэнка па ярыне прыпадае на Полаччыну—ячмень на 15 чэрвеня—1,5 і авёс—1,8 і Віцебшчыну—ячмень—1,9 і авёс—2. Трохі лепш у гэтых акругах з азімымі пасевамі—у Полаччыне 2,4 і Віцебшчыне—2,3.

У заключэньне можна сказаць, што за ўраджай азімых пасеваў па ўсёй БССР у даны момант апаскі няма. Што-ж датычыцца пасеваў ярыны, дык, калі надвор'е ня зьменіцца ў лепшы бок, можна чакаць некаторага пагоршаньня іх становішча.

З-чык.

Абсьледваньне савецкіх ячэек.

ЦКК КП(б)Б намеціла правесьці выбарачным парадкам праверку выконваньня савецкімі ячэйкамі дырэктыў партыі па барацьбе з бюракратызмам, валакітай і іншымі недахопамі савецкага апарату.

У мінулы 1927 г. было таксама праведзена абсьледваньне праверкі выкананьня рэзалюцыі ЦК УсесКП(б) па рабоце савецкіх ячэек і на падставе матар'ялу абсьледваньня Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і Бюро ЦК КП(б)Б прынялі практычную рэзалюцыю, якая адзначае недахопы працы і прапануе іх зьнішчыць. Асабліва ў гэтай рэзалюцыі падкрэсьліваецца ўдзел савецкіх ячэек у рацыяналізацыі савецкага апарату, яго спрашчэньні і патаньні.

Важнейшыя пастановы, якія вынесены за апошні час вышэйшымі партыйнымі органамі, пачынаючы ад 15 зьезду УсесКП(б), красавіковага Аб'яднанага Пленуму ЦК і ЦКК УсесКП(б) і канчаючы адозваю ЦК УсесКП(б) аб правядзеньні лёзунгу самакрытыкі, ставяць цэлы шэраг новых пытаньняў, ажыцьцяўленьнем якіх павінны былі заняцца савецкія ячэйкі.

Гэтыя асноўныя пытаньні зьяўляюцца адпраўнымі галоўнымі пунктамі, пад вуглом гледжаньня якіх будзе праходзіць праверка.

Канкрэтна пры абсьледваньні прыдзецца астанавіцца на такіх момантах:

Якія пытаньні па палепшаньні апарату і барацьбе з бюракратызмам узьнімалі паасобныя партыйцы. Выпадкі замоўчваньня вядомых ячэйцы ў цэлым ці паасобным камуністым данай установы фактаў бюракратызму, валакіты, безгаспадарчасьці, растрат, пратэкцыянізму і іншых недахопаў установы.

Ці прымаліся якія-небудзь мерапрыёмствы і па чыёй ініцыятыве, каб уцягнуць у абгаварэньне і крытыку працы данай установы тыя колы працоўнага насельніцтва, якое абслугоўваецца гэтай установай.

Як пастаўлена справа з абслугоўваньнем наведвацеляў, ці атрымоўваюць апошнія хутка даведкі, патрэбныя ім (пямная справка, разьмеркаваньнем гадзін прыёмку кіраўнікоў). Ці маюцца выпадкі нядбайных адносін да наведвацеляў і як на гэтыя выпадкі рэагавала ячэйка. Ці ставілася на абгаварэньне пытаньне адносна зьмены часу працы установы.

Як сачыла ячэйка за выкананьнем прапаноў КК-РСІ і як ячэйка дапамагала і арганізавала дапамогу гэтым органам (рэз. XV зьезду).

Ці было кіраўніцтва мясцкомам у напрамку таго, каб апошнім вялася выхаваўчая праца сярод супрацоўнікаў у сэнсе падрыхтоўкі кожнага служачага ў напрамку адданасьці спрэ сацыялістычнага будаўніцтва і б[illegible] язьні выкрываючага розныя недахопы і бюракратычныя зьявішчы.

Ці асьвятлялася пытаньне па барацьбе з бюракратызмам і іншымі недахопамі апарату данай установы ў мясцовай насьценнай газэце. Як адносілася адміністрацыя да асьвятленьня недалікаў у насьценнай газэце; ці падвяргаліся розным ганеньням сьценкоры з боку адміністрацыі за высьвятленьне ў насьценнай газэце фактаў бюракратызму, валакіты, грубых адносін і інш.

Пажадана, каб аб пералічаных недахопах свае ячэйкі паасобныя працаўнікі (партыйцы і беспартыйныя) і рабкоры прыйшлі на дапамогу пры абсьледваньні ўказаньнямі на матар[illegible] ці паасобныя факты, зьявішча і і[illegible]. А таксама, яшчэ да абсьледваньня [illegible] чалі асьвятляць паасобныя вучас[illegible] працы савецкіх ячэек, як у друкаваных, так і ў насьценных газэтах.

Такім чынам будзе дабыт пры абсьледваньні больш каштоўны матар'ял, які яшчэ дапаможа зьнішчыць мажчыяся недахопы савецкага апарату.

П. Пасюневіч.

Аб насеннаводзтве ў БССР.

Пытаньні насеннаводзтва ў БССР набогул, а ў прыватнасьці бульбяна е, —набывае зусім актуальнае значэньне. Рынак да нас прад'яўляе пратэзіі ў пачатку лета на добрыя сталовыя ранынія сарты, якія з посьпехам могуць экспартавацца ў Ленінград, Харкаў і др. гарады СССР па даволі высокіх цэнах, ня кажучы ўжо аб снабжэньні буйных гарадоў БССР. Ня мыляючыся можна сказаць, што бульбяны рынак на УССР адкрыты наогул, што дастаўка добраякасных сталовых сартоў на Украіну мажліва толькі з БССР, але гэтым нехта павінен заціквіцца і паклапаціцца, каб тыя мажлівасьці, якія ў нас ёсьць, былі выкарыстаны на ўсе 100 проц.

